WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ЛЮТАГА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 21
(26885)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ ПРАІНДЭКСАВАНЫ ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ І НЕКАТОРЫЯ ВІДЫ ПЕНСІЙ

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, зацверджаны новыя памеры бюджэтаў пражытковага мінімуму ў цэнах снежня. У прыватнасці, з пачатку лютага «сярэдні» БПМ на кожнага члена сям'і з 4 чалавек складае 296.870 рублёў — гэта на 4,9 працэнта перавышае пакасчык папярэдняга квартала.**

Адпаведна, з 1 лютага права на штомесячную адрасную сацыяльную дапамогу могуць атрымаць сем'і, дзе даход на кожнага чалавека не перавышае тыя ж 296.870 рублёў. Разліковая гранічная «планка» даходаў для прызначэння аднаразовай адраснай дапамогі вызначана ў 445.305 рублёў.

Як заўважылі ў міністэрстве, у сувязі са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму будзе праведзена індэксацыя выплат на дзяцей. Цяпер штомесячная дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў вызначана ў 296.870 рублёў. Памер аднаразовай заахвочвальнай дапамогі маці, якія сталі на ўлік у жаночай кансультацыі да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, складае таксама 296.870 руб., аднаразовай дапамогі пры нараджэнні першага дзіцяці — 1 484.350 руб., а пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 2 078.090 рублёў.

Плюс да таго пасля змянення БПМ праводзіцца пераразлік мінімальных, сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў. Іх рост складзе 3,8—4,9 працэнта. У прыватнасці, новы памер мінімальнай пенсіі па ўзросце з даплатай будзе адпавядаць 268.110, а сярэдні памер сацыяльнай пенсіі — 253.640 рублям.

**Сяргей ГРЫБ.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ ПРЫВІТАННЕ Ў СУВЯЗІ З ПАЧАТКАМ РАБОТЫ АРХІРЭЙСКАГА САБОРУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу, епіскапату Праваслаўнай царквы і ўсім вернікам у сувязі з пачаткам работы Архірэйскага сабору.**

«На працягу стагоддзяў Праваслаўная царква была апорай міру і спакою, клапацілася аб маральным удасканаленні чалавека, захаванні культурных і нацыянальных традыцый», — гаворыцца ў пасланні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што праца Архірэйскага сабору будзе садзейнічаць умацаванню супрацоўніцтва дзяржавы і Царквы, дасягненню сапраўднай сімфоніі ў іх узаемаадносінах.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ УРУЧЫЎ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖАНЫМ ЛЮДЗЯМ КРАІНЫ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч учора па даручэнні Прэзідэнта ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Узнагароды атрымалі 54 чалавекі. Гэта эколагі, медыкі, энергетыкі, работнікі сельскай гаспадаркі, прадстаўнікі адукацыі і спорту.

Кіраўнік беларускага ўрада на ўрачыстай цырымоніі ўручэння ўзнагарод падзякаваў узнагароджаным за сумленную шматгадовую творчую працу і высокі прафесіяналізм. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што сярод узнагароджаных — вялікая група работнікаў аграпрамысловага комплексу Брэсцкай вобласці. «Сапраўды, Брэстчына за апошнія гады стабільна прыбаўляе ў развіцці сельскай гаспадаркі, атрымлівае больш як 1 млн тон збожжа, тут расце вытворчасць алейнага семя рапсу, бульбы. Добрыя паказчыкі дэманструе вобласць і ў жывёлагадоўлі», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Паводле яго слоў, развіццё АПК і далей будзе адным з прыярытэтаў беларускай эканомікі.

Асаблівую ўвагу прэм'ер-міністр звярнуў на заслугі эколагаў. «У нас у Беларусі ахове прыроды заўсёды ўдзялялася дзяржаўная ўвага, захаваны ўнікальныя прыродныя комплексы, ландшафтная і біялагічная разнастайнасць, — сказаў ён. — Ад імя ўрада хачу падзякаваць работнікам гэтай важнай сферы за працу па ахове нацыянальнага багацця. Неабходна і далей фарміраваць экалагічную культуру насельніцтва, развіваць мясцовыя прыродаахоўныя ініцыятывы».

Падзякаваў за добрасумленную працу Міхаіл Мясніковіч і работнікам аховы здароўя. «Узнагароджваючы медыкаў, дзяржава пацвярджае свой пастаянны клопат аб здароўі чалавека, — падкрэсліў ён. — Мы і далей будзем стымуляваць працу ўрачоў, сярэдняга і малодшага медыцынскага персаналу, рабіць усё, каб у медыцынскія адукацыйныя ўстановы ішлі людзі, якім неабыякава здароўе чалавека».

Міхаіл Мясніковіч канстатаваў, што часта ў сельскай мясцовасці, аддаленых рэгіёнах, чарнобыльскай зоне не хапае вузкапрофільных урачоў. «Аднак дзякуючы ўвазе да медыцыны з боку кіраўніка дзяржавы, урада мы вырашым і гэтыя пытанні», — дадаў ён. Паводле слоў прэм'ер-міністра, у бліжэйшыя гады ў Беларусі плануецца сфарміраваць магутную базу па вытворчасці айчынных лякарстваў, прадоўжыць аснашчэнне медыцынскіх цэнтраў сучаснай тэхнікай. «Трэба будзе пашырыць прадастаўленне першаснай медыцынскай дапамогі, асабліва ў сельскай мясцовасці», — праінфармаваў Міхаіл Мясніковіч.

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч звярнуў на дасягненні беларускай адукацыі. У той жа час ён адзначыў: «Тут не павінна быць галавакружэння ад поспехаў, трэба прыбаўляць і ў адукацыі, і ў спорце». Міхаіл Мясніковіч канстатаваў, што кошт адукацыі ў Беларусі расце. «Але ў нас яна даражэе крыху менш, чым на Захадзе», — падкрэсліў ён. Кіраўнік урада адзначыў таксама неабходнасць прыцягнення ў беларускія ВНУ на навучанне студэнтаў з еўрапейскіх краін. «Чаму сёння да нас не едуць ва ўніверсітэты атрымліваць адукацыю з краін Усходняй Еўропы, Балтыі? — задаў заканамернае пытанне прэм'ер-міністр. — Калі мы гаворым, што ў нашых ВНУ могуць навучацца іншаземцы, усе чамусьці арыентуюцца на тое, што гэта прадстаўнікі Паўднёва-Усходняй Азіі або Афрыкі. А чаму не Еўропы? Уздымаючы ўзровень адукацыі, мы павінны імкнуцца, каб гэты ўзровень адпавядаў еўрапейскаму, і не толькі па нейкіх выбіральных пазіцыях».

## САНКЦЫІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ ЗВЫЧАЙНА МАЮЦЬ ЗВАРОТНЫ ЭФЕКТ ДЛЯ ІХ ІНІЦЫЯТАРАЎ

**Санкцыі, якія асобныя дзяржавы або група дзяржаў уводзяць у адносінах да Беларусі, звычайна маюць зваротны эфект для тых, хто ініцыіраваў іх увядзенне. Такую думку карэспандэнту БЕЛТА выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях Мікалай Самасейка.**

Каментуючы ўвядзенне санкцый з боку Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі, дэпутат падкрэсліў, што з такімі рашэннямі рэспубліцы даводзіцца сутыкацца ўжо не першы раз. Еўрапейскія структуры і раней выкарыстоўвалі метады санкцый і абмежаванняў у адносінах да Беларусі. «Верагодна, яны да гэтага часу да канца не ўсвядомілі бесперспектыўнасць і неэфектыўнасць такой палітыкі, бо практыка ўжо даказала, што звычайна санкцыі маюць зваротны эфект», — адзначыў Мікалай Самасейка.

Парламентарый лічыць, што прадстаўнікі Еўрасаюза выкарыстал і падзеі на плошчы Незалежнасці ў Мінску 19 снежня «як прычыну для абвінавачання Беларусі ў недэмакратычнасці і для замоўчвання саміх вынікаў выбараў».

## САНКЦЫІ ЕС СУПРАЦЬ ЖУРНАЛІСТАЎ ПАРУШАЮЦЬ ПРЫНЦЫП СВАБОДЫ СЛОВА, ЗАЯЎЛЯЕ МІНІСТР ІНФАРМАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**Міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі нагадвае еўрапейскім чыноўнікам пра адзін з фундаментальных прынцыпаў еўрапейскай дэмакратыі — свабоду слова.**

У інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс—Захад», каментуючы апублікаваны «спіс неўязных», Алег Праляскоўскі заявіў, што «складальнікі спісу ў Брусэлі забыліся на ключавы, фундаментальны прынцып дэмакратыі — свабоду слова».

Міністр, які таксама трапіў у «чорны спіс», не стаў каментаваць факт свайго ўключэння ў яго, адзначыўшы, што рашэнне савета ЕС у дачыненні да журналістаў «з'яўляецца горшым узорам савецкай прапаганды, які ўзводзіць жалезную заслону вакол еўрапейскіх дзяржаў».

«Журналіст выконвае сваю працу, ён выказвае сваю пазіцыю. Атрымліваецца, калі гэта пазіцыя не супадае з афіцыйнай пазіцыяй Брусэля, еўрачыноўнікі робяць яго неўязным», — сказаў кіраўнік Мінінфарма. «Гэта фактычна не толькі расправа з іншадумцамі-журналістамі, але і забарона на прафесію», — рэзюмаваў ён. Міністр нагадаў, што напярэдадні выбараў у Беларусі, «еўраструктуры падымалі шум з нагоды і без, калі замежным журналістам не выдавалі акрэдытацыю дзень у дзень для працы ў Беларусі». «Тут жа прынятыя беспрэцэдэнтныя меры пакарання іншадумцаў», — адзначыў ён.

ISSN 1990 - 763X

## «ЦЕЛЯХАНЫ НЕ ПАДВЯДУЦЬ!»



Удзельніцы раённага спаборніцтва па лыжных гонках у Ганцавічах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Вяртанне беларускіх турыстаў з Егіпта чакаецца цягам бліжэйшага тыдня

*Аднак некаторыя суайчыннікі вырашылі не адмаўляцца ад запланаванай паездкі туды нават пасля вядомых падзей у гэтай краіне*

**Як паведаміў журналісту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства спорту і турызму Віталь СЯМАШКА, калі па стане на вечар 1 лютага ў Егіпце знаходзіліся 2 140 нашых суайчыннікаў, дык па стане на 14 гадзін учарашняга дня беларусаў у гэтай краіне афрыканскага кантынента заставалася ўжо каля 1 800 чалавек.**

Іншымі словамі, нашы суграмадзяне пачалі вяртацца з Егіпта, прыслухаўшыся ў тым ліку з гэтай нагоды і да рэкамендацый Міністэрства спорту і турызму не заставацца ў неспакойным на дадзены момант рэгіёне. Адносна магчымых пацярпелых інфармацыі ў міністэрства не паступала. Самі турысты, якія вярнуліся на радзіму, кажуць пра тое, што ў курортных зонах, дзе яны знаходзіліся на адпачынку, ніякіх хваляванняў не было і іх бяспецы нічога не пагражала. Нагадаем, тым адпачывальнікам, што вырашылі не вяртацца тэрмінова, было таксама рэкамендавана не пакідаць курортныя зоны і не наведваць Каір.

— Тым не менш нашы суайчыннікі, нягледзячы на ўсе вядомыя падзеі, працягваюць зараз ехаць у Егіпет на адпачынак. Працэнт адмовы ад загадзя замоўленых тураў туды па розных турыстычных фірмах розны, даходзіць да 40 працэнтаў. З гэтай колькасці адмоўнікаў прыкладна 10 працэнтаў адмаўляюцца ад падарожжа ў Егіпет на карысць тураў у Турцыю, Арабскія Эміраты, — паведаміў Віталь Яўгенавіч.

Як вядома, рэгулярных авіярэйсаў Нацыянальная кампанія «Белавія» з Каірам не мае, аэрапорты знаходзяцца ў іншых гарадах. Якім чынам беларусы вяртаюцца назад? У Міністэрстве спорту і турызму зазначылі, што такой інфармацыяй не валодаюць: відавочна, вяртаюцца з дапамогай тых жа авіякампаній, чыімі рэйсамі і патрапілі ў Егіпет.

**Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Андрэй САВІНЫХ** патлумачыў, што ўсіх нашых суайчыннікаў, якія знаходзяцца ў Егіпце, можна падзяліць на дзве групы: уласна турыстаў, якіх, дарэчы, у Каіры не так і шмат, і беларусаў, што пабраліся шлюбам з егіпцянамі, — жонак, дзяцей, іншых родных.

— Аэрапорты працуюць, і ў выпадку неабходнасці, беларусы, якія пастаянна пражываюць у гэтай краіне, змогуць пакінуць краіну разам са сваімі роднымі-егіпцянамі. Для апошніх будуць адкрытыя аднаразовыя гасцявыя візы тэрмінам да 90 дзён, — сказаў Андрэй Уладзіміравіч.

Што ж датычыцца беларусаў-турыстаў, дык яны пераважна знаходзяцца ў курортных зонах, дзе становішча даволі спакойнае і няма тых хваляванняў, што ахапілі сталіцу краіны. Па інфармацыі міністэрства, пацярпелых сярод беларускіх грамадзян няма. Прэс-сакратар выказаў меркаванне, што турысты, якія зараз знаходзяцца ў курортных зонах, пакінуць Егіпет у бліжэйшы тыдзень.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЕГІПЦЕ ПАЧАЛІСЯ ВУЛІЧНЫЯ БАІ З УДЗЕЛАМ ВЕРШНІКАЎ



**У сераду ў цэнтры Каіра сталі збірацца тысячы дэманстрантаў, якія выступаюць супраць цяперашняга рэжыму. Адначасова на вуліцы выйшлі прыхільнікі прэзідэнта Хосні Мубарака, які напярэдадні хоць і паабяцаў больш не балатавацца на гэтую пасаду, аднак адмовіўся да верасня сыходзіць у адстаўку, як настойвала апазіцыя. Неўзабаве сталі паступаць паведамленні пра першыя вулічныя бойкі: мяркуючы па тым, што з месца перадаюць тэлеканалы, сутыкненні вельмі разлютаваныя, з усіх бакоў ёсць загінулыя, рахунак параненых ідзе на сотні.**

Сутычкі і слоўныя сваркі паміж прыхільнікамі і супернікамі Хосні Мубарака адбыліся на плошчы Тахрыр. Al-Jazeera распавядае, што супернікі пусцілі ў ход камяні і арматуру. У цэнтры горада ўздымаецца вялікае воблака белага дыму, перадае канал. У той жа час тэлеканал Al-Arabiya паведаміў, што прыхільнікі прэзідэнта ў Каіры напалі на здымачную групу і разбілі камеру. Раздаліся стрэлы. Паводле звестак на момант падпісання нумара ў друк, армія не перайшла ні на адзін бок і спрабавала выбудаваць паміж супернікамі барыкады.



### У ЛІТВЕ ПРАПАНАВАЛІ ВЯРНУЦЬ У ПАШПАРТ ПАЗНАЧЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ

**Літоўскі дэпутат ад апазіцыйнай Працоўнай партыі Мечысловас Засчурынскас прапанаваў вярнуць у пашпарты пазначэнне нацыянальнасці, паведамляе ІА REGNUM. Адпаведны законапраект ён ужо зарэгістраваў у Сойме.**

Калі дакумент будзе прыняты, грамадзяне Літвы змогуць па жаданні ўказваць у пашпарце сваю нацыянальнасць. Ці будзе пры гэтым абмежаваны іх выбар (ці зможа чалавек пры выбары кіравацца толькі нацыянальнасцю бацькоў або ён зможа назваць сябе прадстаўніком любой этнічнай групы па сваім жаданні), не ўдакладняецца.

Указанне нацыянальнасці ў пашпартах, паводле інфармацыі Runet.lt, было скасавана ў 2003 годзе.

### НАЗВАНЫ ТЭРМІН ДАСЯГНЕННЯ ДАПУШЧАЛЬНАГА ДОЎГУ ЗША

**Дзяржаўны доўг ЗША перавысіць максімальна дапушчальную адзнаку ў 14,29 трыльёна долараў ЗША ў тэрмін ад 5 красавіка да 31 мая 2011 года. Пра гэта паведамляе Agence France-Presse са спасылкай на звесткі Міністэрства фінансаў ЗША.**

Верхняя планка дзярждоўгу ўздымаецца ў ЗША адмысловым законапраектам. З 1940 года такіх законапраектаў было ўхвалена каля сотні. Апошні раз планка ўздымалася ў 2010 годзе, калі дапушчальны доўг быў павялічаны адразу на 1,9 трыльёна долараў. Дзярждоўг ЗША расце імклівымі тэмпамі ўсе апошнія гады. У 2008 годзе ён упершыню перавысіў адзнаку ў 10 трыльёнаў долараў, з-за чаго спыніўся «Гадзіннік нацыянальнага доўгу» (National Debt Clock), размешчаны ў Манхэтане: на ім проста скончыліся вольныя разрады. У адносінах да ВУП аб'ём дзярждоўгу ЗША набліжаецца да ста адсоткаў ВУП.

### СУСВЕТНЫ КОШТ НА ЦУКАР ДАСЯГНУЎ 30-ГАДОВАГА МАКСІМУМУ



**Сёння кошт сакавіцкіх ф'ючэрсаў на цукар-сырэц на нью-ёркскай біржы ICE Futures U.S. вырас на 2,4% да 34,79 цэнта за фунт, што стала самым высокім паказчыкам з лістапада 1980 года. У Лондане ф'ючэрсы на рафінаваны цукар падаражэлі на 1,9% да $834,70 за тону.**

За мінулыя 12 месяцаў цукар падаражэў на 18% на гандлі ў Нью-Ёрку з-за слабых ураджаяў у Бразіліі, Пакістане і шэрагу краін Еўропы. Сённяшні рэзкі рост кошту на цукар звязаны з магчымым уронам, які можа нанесці ўраджаю трыснягу ў Аўстраліі цыклон «Ясі». Гэтая краіна займае трэцяе месца ў свеце па аб'ёме экспарту вышэйназванай аграпрадукцыі.

### WIKILEAKS: «АЛЬ-КАЙДА» ХУТКА ВЫРАБІЦЬ «БРУДНУЮ БОМБУ»

**Тэрарыстычная арганізацыя «Аль-Кайда» хутка зможа вырабіць радыеактыўную зброю — так званыя «брудныя бомбы». Яна ўжо назапасіла радыеактыўныя матэрыялы і прыцягнула ў свае шэрагі навукоўцаў-ізгояў, абвяшчаюць сакрэтныя дыпламатычныя дакументы, якія апублікаваў сайт уцечак WikiLeaks.**

У тысячах дакументаў для службовага карыстання, атрыманых WikiLeaks і перададзеных брытанскай газеце The Daily Telegraph, паведамляецца пра барацьбу супраць распаўсюджвання ў свеце ядзерных, біялагічных і хімічных матэрыялаў ваеннага прызначэння, якая прыняла міжнародны маштаб.

Тэрарысты валодаюць тэхнічнымі ведамі, дастатковымі для вытворчасці выбуховай прылады, больш складанай, чым проста «брудная бомба». Яны распачалі відавочную спробу атрымаць матэрыялы, якія расшчапляюцца. Пра гэта паведаміў амерыканскім спецслужбам у чэрвені 2008 гады саветнік па нацыянальнай бяспецы Індыі.

На сустрэчах прадстаўнікоў спецслужбаў таксама было сказана, што тэрарысты блізкія да вытворчасці «працаздольных і эфектыўных» узораў хімічнай і біялагічнай зброі, здольнай знішчыць тысячы чалавек.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 006,00 | 1 чэшская крона | 172,57 |
| ▲ 1 еўра | 4 157,30 | 1 польскі злоты | 1 065,43 |
| 1 латвійскі лат | 5 922,57 | ▲ 1 расійскі рубель | 102,17 |
| 1 літоўскі літ | 1 203,29 | 1 украінская грыўня | 378,04 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,4219 |
| 10 UAH | 37,0087 |
| 1000 BYR | 9,7682 |
| EUR | 40,7258 |

## СПІРТУ МНОГА НЕ БЫВАЕ

Больш за 550 літраў вадкасці, якая змяшчае спірт, супрацоўнікі Рагачоўскага аддзела ўнутраных спраў знайшлі ў затрыманым аўтамабілі «Фіат-Дуката», якім кіраваў мясцовы 44-гадовы беспрацоўны. У машыне стаяла 97 пяцілітровых каністраў са спіртам і 16 — з каньяком.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*На слыху*

## ЦІ БУДУЦЬ У НАС ШТРАФАВАЦЬ ЗА АДЧЫНЕНЫЯ ЗІМОЙ ФОРТКІ

**Як паведамляе газета «Камсамольская праўда ў Расіі», у Бураціі распрацоўваецца закон аб энергазберажэнні, які будзе прадугледжваць адміністрацыйную адказнасць за яго парушэнне і ўзмацненне кантролю.**

Адна з прапаноў закона, якая разглядаецца зараз, — штрафы жыхароў за адчыненыя зімой форткі.

— Калі чалавек адчыняе фортку, значыць ён у кватэры не ўсталяваў рэгулюючую апаратуру, таму яму горача і прасцей адчыніць акно. І выкінуць тым самым каштоўнае цяпло на вуліцу. Ён павінен несці за гэта фінансавую адказнасць, — сцвярджае Вячаслаў Нагавіцын, прэзідэнт Бураціі.

Якім чынам будзе ажыццяўляцца кантроль за адчыненымі форткамі і колькі спецыялістаў на гэта будзе патрэбна, у артыкуле не ўдакладняецца.

Дарэчы, у беларускім заканадаўстве таксама прадугледжваецца пакаранне за «парушэнне правілаў карыстання электрычнай ці цеплавой энергіяй» (арт 20.10 Адміністрацыйнага кодэкса РБ). Згодна з ім, калі вы самавольна падключыліся да прыёмнікаў электрычнай ці цеплавой энергіі, пашкодзілі лічыльнікі ці пачалі самавольна зліваць ваду з сістэмы цеплазабеспячэння, а таксама здзейснілі «іншыя парушэнні правілаў карыстання электрычнай ці цеплавой энергіяй», то вам пагражае штраф у пяціразовым памеры нанесенага ўрону.

— Шчыра кажучы, каб у Беларусі штрафавалі за адчыненыя форткі, — такіх выпадкаў я не ведаю, — пракаментаваў сітуацыю **Ігар ГАНЧАРЫК, начальнік аддзела энергетыкі ДА «Мінская гарадская камунальная гаспадарка»**. — І нейкіх ідэй на гэты конт я таксама не чуў.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## «КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПУЦЁЎКАМІ Ў САНАТОРЫІ ЎСЕ ЗАЯВЫ ДЗЯЦЕЙ З ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ЗОНЫ, ДАДАТКОВА НЕАБХОДНА КАЛЯ 30 МЛРД РУБЛЁЎ»

**АБ ГЭТЫМ паведаміў на пасяджэнні, прысвечаным падвядзенню вынікаў выканання Дзяржаўнай праграмы пераадолення наступстваў катастрофы за мінулую пяцігодку, начальнік Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Уладзімір ЧЭРНІКАЎ.**

Паводле яго слоў, за пяць гадоў было асвоена 3,6 трлн. рублёў (116 % ад прадугледжаных у Дзяржпраграме аб'ёмаў). Частка гэтых сродкаў пайшла на мэтавыя мерапрыемствы, у тым ліку і на ахоўныя меры ў сельскай гаспадарцы, другая — на сацыяльную ахову пацярпелых ад катастрофы грамадзян.

— Важным складнікам захавання здароўя грамадзян з'яўляецца іх санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, — адзначыў начальнік Дэпартамента. — Штогод павялічваецца колькасць дзяцей, якія накіроўваюцца на санаторна-курортнае аздараўленне і лячэнне за кошт бюджэтных сродкаў. Калі ў 2006 годзе было аздароўлена 53,8 % дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, то ў 2010 — 66,8%. У той жа час праведзенае ў кастрычніку-лістападзе мінулага года апытанне бацькоў паказала, што выехаць на аздараўленне хацелі 72 % дзяцей.

Асноўныя праблемы тут былі зняты. У прыватнасці, летась дазволілі бясплатны праезд дзяцей на аздараўленне, забяспечылі льготнымі пуцёўкамі бацькоў, якія суправаджаюць дашкольнікаў, расшырылі пералік медыцынскіх працэдур па пуцёўках на аздараўленне. Але ўзнікла новая праблема.

— Аб'ём выдзеленых сродкаў на 2011 год не дазваляе забяспечыць пуцёўкамі ўсіх дзяцей, — паведаміў Уладзімір Чэрнікаў. — Дадаткова неабходна каля 30 млрд рублёў. У сувязі з гэтым рэспубліканскі цэнтр павінен настойліва дабівацца павелічэння фінансавання, бо для 159 тысяч дзяцей, якія хочуць паправіць здароўе, куплена толькі 102 тысячы пуцёвак. Дэпартамент таксама не застанецца ўбаку і акажа цэнтру неабходную дапамогу.

Ёсць незадаволеныя і якасцю аздараўлення і лячэння. Асабліва шмат прэтэнзій, паводле слоў Уладзіміра Чэрнікава, у грамадзян, якія жывуць у пацярпелых раёнах Магілёўскай вобласці. «Бацькі скардзяцца, што з года ў год дзяцей накіроўваюць у адны і тыя ж непрыстасаваныя санаторыі, дзе няма патрэбных умоў. Гэта, напрыклад, санаторый «Сосны» і імя Леніна. Але, нягледзячы на гэта, цэнтр з маўклівай згоды аблвыканкама працягвае закупляць там пуцёўкі за кошт чарнобыльскіх сродкаў. Па гэтай прычыне ў Слаўгарадскім і ў Быхаўскім раёнах больш за 40 % дзяцей адмаўляецца ад бясплатнага аздараўлення. Аналагічная сітуацыя з аздараўленнем дзяцей у міжсезонне ў Сочы, Туапсэ і Крыме. Паколькі дарослыя ў гэты перыяд туды не едуць, функцыянаванне ўстаноў забяспечваецца за кошт пацярпелых ад катастрофы дзяцей. Прашу Міністэрства аховы здароўя даць заключэнне аб мэтазгоднасці такога аздараўлення, асабліва з улікам таго, што кошт яго ў два разы перавышае кошт аздараўлення ў рэспубліцы».

Усе школьнікі, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях, забяспечваюцца бясплатным гарачым харчаваннем. З гэтага вучэбнага года такая льгота прадастаўляецца і дзецям, якія наведваюць школы на забруджанай тэрыторыі, але пражываюць у «чыстых» населеных пунктах.

— Кантралюючыя органы неаднаразова фіксавалі недахопы па якасці харчавання школьнікаў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, — падкрэсліў начальнік Дэпартамента. — Дзясяткі работнікаў панеслі за гэта пакаранне. Але разам з суб'ектыўнымі прычынамі гэтай з'явы ёсць і аб'ектыўныя. Адна з іх — зношванне тэхналагічнага абсталявання школьных сталовых. Сёння ў рэспубліцы да 14 % тэхналагічнага абсталявання патрабуюць замены. А ў Буда-Кашалёўскім і Веткаўскім раёнах сітуацыя адна з самых вострых: там трэба замяніць адпаведна 40 % і 44 % абсталявання. Каб паскорыць рашэнне гэтай праблемы, частка абсталявання для школьных сталовых будзе куплена за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Але гэта не здымае адказнасці з мясцовых органаў улады, якія на акрэсленую праблему чамусьці не звяртаюць патрэбнай увагі.

У мінулую пяцігодку значныя сродкі былі накіраваны і на паляпшэнне кадравага забеспячэння прадпрыемстваў і арганізацый, размешчаных на забруджаных тэрыторыях.

— Найбольш хуткімі тэмпамі паляпшаецца сітуацыя ў Гомельскай вобласці, дзе за мінулы год дэфіцыт урачоў зменшыўся амаль у два разы, — адзначыў Уладзімір Чэрнікаў. — У той жа час у шэрагу раёнаў іх па-ранейшаму не хапае. А ў Быхаўскім і Чавускім раёнах іх стала менш, чым год таму. Са свайго боку Дэпартамент будзе падтрымліваць будаўніцтва жылля для спецыялістаў у пацярпелых рэгіёнах за кошт чарнобыльскіх сродкаў. Але, як паказвае практыка, наяўнасць жылля не выратоўвае сітуацыю. Трэба каб і Міністэрства аховы здароўя, і мясцовыя органы ўлады паклапаціліся аб умовах працы і адпачынку, дастойным узроўні зарплаты, наяўнасці ў раёне дзіцячых садкоў, школ, крамаў, спартыўных і культурных устаноў.

Пры ўдзеле Дэпартамента распрацавана і зацверджана Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011—2015 гады. Падрабязней аб задачах, якія стаяць на бліжэйшыя пяць гадоў, чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў у эксклюзіўным інтэрв'ю з першым намеснікам начальніка Дэпартамента ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Анатолем ЗАГОРСКІМ.

**Надзея ДРЫЛА.**

*Як нас дураць*

## ТЭЛЕФОН У КРЭДЫТ

*Махляр афармляў крэдыты на пакупку мабільнікаў на прасцякоў*

**Прычым пераважная большасць падманутых хітруном — гэта людзі, якія сябруюць з «зялёным змеем». Паводле звестак прэс-афіцэра Ленінскага РУУС Сяргея Козела, сваіх ахвяр махляр падбіраў менавіта сярод гэтай катэгорыі грамадзян. Мабыць, таму з «кліентурай» у прайдзісвета і не было праблем.**

26-гадовы падазроны дзейнічаў наступным чынам: прасіў аказаць яму дапамогу ў куплі мабільніка і браў пашпарт даверлівага чалавека, на які і «вешаў» крэдыт. А каб прасцякі больш ахвотна ішлі на кантакт, ён узнагароджваў іх пэўнай сумай грошай: яна вар'іравалася ад 20 да 70 тысяч рублёў. У гэты «бізнэс» махляр уключыўся актыўна: дастаткова згадаць, што ў адным з выпадкаў з розніцай у 20 хвілін ён аформіў у крэдыт два мабільныя тэлефоны агульным коштам 1,5 мільёна рублёў. Адметна, што некаторыя пацярпелыя ўсведамлялі пра «развод» толькі тады, калі атрымлівалі неаднаразовыя апавяшчэнні пра неабходнасць пагашэння крэдыту.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



## УСХОДНІ ТРУС СПРАБУЕ МІНСКІ ЛЁД

Сёння пачынаецца Год Труса (Ката) па Усходнім календары.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
3 лютага 2011 г.
№ 4 (242)

СЕСІЯ

# ШТО ЗА ЛІЧБАМІ?

**На сумесным пасяджэнні сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і аблвыканкама абмеркавалі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці ў 2006—2010 гадах і задачы на новую пяцігодку.**

У Прынямонні выканалі большасць прадугледжаных на мінулую пяцігодку паказчыкаў, у тым ліку па вытворчасці прамысловай прадукцыі, спажывецкіх тавараў, экспарце тавараў і паслуг, тавараабароце, платных паслугах, аб'ёмах інвестыцый у асноўны капітал. Рэальная зарплата за перыяд 2006—2010 гадоў у вобласці павялічылася на 60 працэнтаў.

Разам з тым, не забяспечана выкананне даведзеных заданняў па тэмпах росту валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі, імпарце тавараў і паслуг. З заданнямі па вытворчасці валавой сельскагаспадарчай прадукцыі справіліся толькі Воранаўскі, Гродзенскі і Смаргонскі раёны. Ды і што датычыцца прамысловасці, то за станоўчымі паказчыкамі ў цэлым па вобласці можна бачыць не толькі перадавікоў, але і шэраг так званых аўтсайдараў.

Што за лічбамі? У прыватнасці, невыкананне вобласцю вызначанага на мінулы год задання па ўводзе ў эксплуатацыю жылля тлумачылася на пасяджэнні несвоечасовым забеспячэннем праектна-каштарыснай дакументацыяй, адставаннем будаўніцтва інжынерных сетак, уключэннем у планы шэрагу аб'ектаў без пацвярджэння крыніц фінансавання. Праўда, **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА**, калі меркаваць па яго выказваннях падчас пасяджэння, быў незадаволены толькі канстатацыяй недахопаў, якія існуюць: «Мы збіраемся не для агучвання статыстыкі, а для ацэнкі працы кадраў. Як будуць вырашацца гэтыя праблемы? Каму і што трэба зрабіць? Хто канкрэтна недапрацоўвае? Каго трэба адзначыць са станоўчага боку?»

Дарэчы, прыклад паказаў сам Сямён Шапіра, падзякаваўшы за працу некаторым кіраўнікам райвыканкамаў. Пры гэтым былі названы і тыя, хто, на яго думку, недапрацоўвае, і патлумачана, канкрэтна ў чым. А аднымі з важнейшых ключавых пытанняў, якія, лічыць кіраўнік вобласці, яшчэ трэба будзе прадумаваць, з'яўляюцца прыцягненне ў эканоміку інвестыцый, а таксама выключэнне неабгрунтаванага імпарту. «Трэба спыніць паток валюты па імпарце. Гэтая праблема перарастае ў плоскасць палітычную, становіцца пытаннем эканамічнай бяспекі краіны», — зазначыў Сямён Шапіра.

На тым жа пасяджэнні дэпутаты абласнога Савета зацвердзілі шэраг мэтавых праграм: па развіцці асабістых падсобных гаспадарак, сацыяльнага абслугоўвання, паляпшэння ўмоў і аховы працы. Больш за два мільярды рублёў мяркуецца накіраваць на рэалізацыю праграмы па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці інвалідаў і іншых катэгорый фізічна аслабленых людзей. Такое асяроддзе ўключае аб'екты сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктуры, дзе павінны ўлічвацца патрэбы гэтай катэгорыі асоб, а таксама ўсе віды інфармацыі, што перадаецца людзям з парушэннем слыху і зроку. Пачынаючы з 2007 года, на Гродзеншчыне да патрабаванняў безбар'ернага асяроддзя прыстасаваны 759 аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры — гандлёвага, бытавога, камунальнага абслугоўвання, аховы здароўя, адукацыі, банкаўскіх паслуг і іншых. Аднак яшчэ больш трэба зрабіць, прычым, не толькі пры будаўніцтве новых аб'ектаў, але і ў грамадскай і жылой забудове, якая ўжо існуе.

Паводле ацэнак **старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Андрэя НАУМОВІЧА**, прадстаўнічая ўлада, як і выканаўчая, будзе прынцыпова ставіцца да канкрэтыкі ва ўсіх праграмных дакументах, што распрацоўваюцца тымі ці іншымі структурамі і прадпрыемствамі. Зразумела, з абавязковым кантролем за іх выкананнем.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

МЯСЦОВЫ ЧАС



# ЖЫЦЦЁ... У КАМП'ЮТАРНЫХ ПАПКАХ

**Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Мясцовыя Саветы дэпутатаў» укаранёна ў двух сельскіх раёнах Магілёўшчыны — Краснапольскім і Касцюковіцкім. Ці палепшыў працу ўваход у адзіную інфармацыйную сетку супрацоўнікаў сельскіх органаў улады і ці аблегчыў жыццё людзям, мы высвятлялі на прыкладзе Беладубраўскага сельскага Савета Касцюковіцкага раёна.**

— Мне патрэбна даведка, каб атрымаць дапамогу на дзяцей, — тлумачыць жыхарка аграгарадка Белая Дуброва Таццяна Чыкава.

Жанчына трымае за руку дачку Яўгенію, але дзяўчынцы з маці не давядзецца доўга чакаць афармлення.

— Хутка і зручна, — літаральна праз некалькі хвілін жанчына трымае ў руках надрукаваны і падпісаны дакумент. — І раней было нядрэнна, а цяпер яшчэ лепш стала.

— Цяпер мы эканомім шмат часу на выдачы даведак, — каментуе і дэманструе працу **кіраўнік справамі Беладубраўскага сельвыканкама Таццяна БАНДАРЭНКА.** — Заходзім у камп'ютарную праграму, набіраем у акенцы патрэбнае прозвішча і адразу маем усе патрэбныя звесткі. Даведка выходзіць з прынтара, я рэгіструю дакумент, старшыня сельскага Савета яго падпісвае, чалавек распісваецца ў атрыманні. Вось і ўсё.

Таццяна 15 гадоў таму прыйшла ў сельсавет працаваць сакратаром. У той час і сам адміністрацыйны будынак месціўся ў жылым доме на два пакоі, без выгодаў, а з прыладаў працы былі толькі стол, шафа і машынка для друкавання.

— Гэтая машынка рабіла дзіркі ў дакументах! — са смехам узгадвае кіраўнік справамі. — Мы яе не выкінулі на сметнік, захоўваем у архіве. Але я нават уявіць не магу, што мы будзем зноў карыстацца машынкай ці пісаць рукой. Справа нават не ў памылках, а ў тым, што даведкі — гэта ладны кавалак працы сельскага органа ўлады. Таму даводзілася шмат часу аддаваць на іх напісанне і людзей затрымліваць. Сёння ж мы гэта робім аўтаматычна.

Што ж, цяпер Белая Дуброва стала аграгарадком, сельскі Савет пераехаў у новы будынак, у ім з'явілася і новая камп'ютарная тэхніка.

— Першы час было страшна з гэтым камп'ютарам: баяліся, не ведалі, куды націснуць, — ківае галавой Таццяна, гледзячы на экран свайго манітора. — Нам падказвалі, нас вучылі. І цяпер без гэтага камп'ютара працы ў нас няма. Калі электрычнасць выключылі — усё спыняецца.

Вось так і наблізілася касцюковіцкая глыбінка да цывілізацыі. Бандарэнка, якая з любой тэхнікай на «вы», прызнаецца, што асвоіла камп'ютар няхутка, але ўрэшце стала вопытным карыстальнікам, на зайздрасць калегам і нават сваім сынам.

Калі Касцюковіцкі раён стаў пілотным ва ўкараненні АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў», камп'ютарны прагрэс пайшоў яшчэ далей. Цяпер усе звесткі пра жыццё сельсавета выкладаюцца на агульны партал. Гэта азначае, што ў розных кутках Беларусі карыстальнікі сістэмы могуць даведацца пра канкрэтнага вяскоўца, яго сям'ю і гаспадарку. Напрыклад, сама Таццяна Бандарэнка мае мужа і двух дзяцей, а ў падсобнай гаспадарцы трымае карову. Штогод пасля 1 студзеня ў АІС аднаўляюцца звесткі пра ўзрост насельніцтва, колькасць выбаршчыкаў, шлюбы і разводы, нараджэнне дзяцей, жыллёвы фонд і чаргу на атрыманне жылля, а таксама пра колькасць кароў і свіней, вытворчасць малака і мяса.

— Раней камп'ютарныя праграмы працавалі асобна, і нам даводзілася дубліраваць усе звесткі, — расказвае Таццяна. — Зараз, калі чалавек нарадзіўся, я ўводжу інфармацыю пра яго ў камп'ютар — і гэта адразу адлюстроўваецца ва ўсіх рэестрах.

Яшчэ адна важная перавага — магчымасць карыстацца вопытам калег у іншых рэгіёнах. Ужо цяпер у камп'ютарнай папцы «Беладубраўскі сельскі Савет дэпутатаў» выкладзены шэраг рашэнняў.

Але самае галоўнае, што новая сістэма ў далейшым дазволіць пазбегнуць мноства запытаў у сельвыканкам з розных арганізацый, таму што ўсю інфармацыю можна адразу ўзяць з партала — увогуле па сельсавеце і па кожным чалавеку асобна.

— Цяпер у сістэме ёсць наш сацыяльны пашпарт, — гаворыць **старшыня Беладубраўскага сельскага Савета Міхаіл ГРЫБАЧОЎ**.

На яго працоўным стале стаіць камп'ютар, які таксама давялося асвойваць з дапамогай падручнікаў і парад больш вопытных калег.

— АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў» дапамагае і нам працаваць, і людзям не марнаваць час, — падкрэслівае Грыбачоў. — Калі раней, каб атрымаць даведку, трэба было гартаць пагаспадарчыя кнігі і папкі з рознымі дакументамі, то сёння гэта робіцца простым націскам кнопкі. Людзям цяпер, каб атрымаць даведку, не трэба сядзець у чарзе. Эканомія часу!

Вось Таццяна Саенка, якая працуе ў малочным блоку мясцовай сельскай гаспадаркі, прыйшла па дакументы, неабходныя для пастаноўкі на жыллёвую чаргу. Жанчына атрымала кансультацыю і даведкі.

— Я яшчэ заспела той час, калі ў старым сельсавеце была машынка для друкавання, — гаворыць Таццяна. — Цяжка было сакратару, ды і свайго часу было шкада. Зараз жа атрыманне даведкі — справа некалькіх хвілін. Гэта зручна.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*



**Жыхарка аграгарадка Белая Дуброва атрымала даведку за лічаныя хвіліны.**

# Адзінокім... не прадастаўляецца інтэрнат

**Мясцовыя ўлады Прыдзвінскага краю ўпершыню ў краіне комплексна падышлі да вырашэння шматлікіх праблем людзей, якія пражываюць у інтэрнатах. Ва ўсіх інтэрнатах на працягу некалькіх гадоў неабходна стварыць годныя ўмовы. Сёння там жыве каля 5 працэнтаў насельніцтва Віцебскай вобласці. І многія толькі мараць атрымаць месца.**

Каля 5,4 тысячы чалавек у вобласці зараз знаходзяцца ў «рэжыме чакання». Большасць з іх — студэнты (3,6 тысячы чалавек). Нярэдка ўмовы пражывання ў інтэрнатах такія, што вяртацца туды з працы ці вучобы не хочацца. Каб выправіць сітуацыю, у Віцебскай вобласці распрацавалі спецыяльную праграму «Інтэрнат». У яе межах у ліку іншага на працягу трох гадоў плануюць узвесці дзесяць будынкаў.

Пытанні інтэрнацкага жыцця абмяркоўваліся і ў Навалукомлі, на выязным пасяджэнні абласных улад. Усяго ў вобласці 315 інтэрнатаў. Тут жыве больш за 60 тысяч чалавек (у тым ліку больш за 4,5 тысячы маладых сем'яў). Большасць інтэрнатаў



*Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.*

знаходзіцца ў буйных гарадах вобласці, 127 — у глыбінцы.

Капітальнага рамонту патрабуюць 142 інтэрнаты. Падчас спецыяльна праведзенага сацыялагічнага апытання высветлілася, што людзі не задаволены часцей за ўсё дрэнным ацяпленнем у пакоях, высокай платай за пражыванне, адсутнасцю пакояў для адпачынку і заняткаў спортам.

Праблема з месцамі ў інтэрнаце характэрная не толькі для невялікіх гарадоў вобласці, але і для Віцебска. Больш за тое — Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў, Віцебскі музычны каледж, а таксама Наваполацкі дзяржаўны політэхнічны каледж наогул не маюць інтэрнатаў. Каб вырашыць гэтую праблему, па даручэнні кіраўніцтва вобласці ўжо сёлета навучэнцы згаданых віцебскіх навучальных устаноў, а таксама медыцынскага каледжа змогуць пасяліцца ў былым інтэрнаце вядомага прадпрыемства «Віцязь» па вуліцы Церашковай. Новы віцебскі інтэрнат для навучэнцаў будзе разлічаны на 500 чалавек. Для Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта таксама хутка пачнецца будаўніцтва двух інтэрнатаў.

А пакуль што... Інтэрнат Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа трэці год знаходзіцца на капітальным рамонце. У сувязі з павелічэннем набору студэнтаў адчуваецца недахоп месцаў у інтэрнатах ВНУ, а таксама віцебскіх медыцынскім і тэхналагічным каледжы, Аршанскім дзяржаўным каледжы чыгуначнага транспарту, Глыбоцкім прафесійным ліцэі... Часта месцы ў інтэрнатах даюцца без уліку санітарных нормаў. І ў выніку там жыве больш людзей, чым дазваляецца.

Не можа не турбаваць праблема злачыннасці ў інтэрнатах. Толькі за дзевяць месяцаў мінулага года ў інтэрнатах Полацка, Наваполацка, Оршы і абласнога цэнтра было зарэгістравана 111 злачынстваў: у асноўным, крадзяжы. Акрамя гэтага, у інтэрнатах адбыліся чатыры пажары.

Калі б адказныя асобы, якія кіруюць прадпрыемствамі і ўстановамі, самі пабывалі — а лепш пажылі — у праблемных інтэрнатах, парадак там наводзіўся б у разы хутчэй.

— У інтэрнаце павінны быць пункт харчавання, трэнажорная зала, медыцынскі пункт, душавая, калі інтэрнат калідорнага тыпу, — лічыць губернатар вобласці Аляксандр Косінец.

Задача стварэння сучасных інтэрнатаў будзе вырашацца на ўзроўні кіраўніцтва вобласці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Ініцыятыва «знізу»

**У Століне прайшоў семінар «Тэрытарыяльнае развіццё: французскі і беларускі вопыт», удзел у якім прынялі прадстаўнікі Столінскага раённага выканаўчага камітэта, Цэнтра сельскага развіцця г. Століна, французскіх — арганізацыі сельгасвытворцаў FERT і асацыяцыі «Зямля і цывілізацыя», Цэнтра сельскага развіцця «Адраджэнне-агра» г. Слаўгарада, Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый г. Мінска.**

Французы расказвалі пра свае напрацоўкі, пра шляхі, якімі прайшлі падчас рэалізацыі аналагічных праектаў не толькі ў сваёй краіне, але і ў іншых, дзе таксама дапамагалі з рэалізацыяй падобных праграм і праектаў. Напрыклад, прадстаўнік FERT Жан Шарль Дэронг, які прымаў удзел у семінары, мае вопыт рэалізацыі аналагічных праектаў у Польшчы, краінах Прыбалтыкі, Албаніі. Таму гасцям было пра што расказаць, у іх ёсць не толькі практычны вопыт, а і абагульнены тэарэтычны, які можна прымяніць для развіцця нашых сельскіх тэрыторый, улічваючы наша заканадаўства, наш менталітэт, звычкі і традыцыі.

Рэалізацыя праекта «Сельскія жыхары (абшчыны) і мясцовыя органы ўлады: партнёрства дзеля ўстойлівага развіцця сельскіх тэрыторый», фінансава падтрыманага Еўрапейскай Камісіяй, на Століншчыне пачалася. У кастрычніку і снежні мінулага года ў вёсках Столінскага раёна прайшла серыя семінараў для сельскіх жыхароў з мэтай прадставіць Цэнтр сельскага развіцця, сам праект, яго падыходы і метадалогію. Уся праца ў рамках праекта будзе накіравана на выяўленне актуальных для сельскіх жыхароў і мясцовых органаў улады ініцыятыў, у рэалізацыі якіх яны зацікаўлены не толькі на словах, але і гатовы прымаць практычны ўдзел, падтрымліваць фінансава свае ж ініцыятывы. Найлепшыя з іх у далейшым будуць падтрыманы фінансава з боку праекта.

Так, бюджэтам праекта прадугледжваецца выдаткаваць 70 тысяч еўра для рэалізацыі ініцыятыў грамадзян, з якіх 60 тысяч вылучае Еўрапейская Камісія і 10 тысяч — Столінскі райвыканкам. Плануецца, што будзе падтрымана каля 10 ініцыятыў.

Расказваючы аб дзейнасці арганізацыі, дырэктар Цэнтра сельскага развіцця Віктар Велясніцкі адзначыў:

— Мы выкарыстоўваем вопыт нашых замежных партнёраў, паколькі аналагічнага вопыту ў нашай краіне яшчэ няма. Але пры гэтым усё прыстасоўваем да нашага грамадства. Задача ў тым, каб працаваць поруч са шматлікімі дзяржаўнымі праграмамі, якія рэалізуюцца ў краіне з мэтай падтрымкі жыхароў сельскай мясцовасці.

Дырэктар Цэнтра падкрэсліў: калі раней жыхары раёна гаварылі толькі пра ініцыятывы эканамічныя, рэалізацыя якіх прыносіць ім пэўны даход, то цяпер размова ўжо ідзе і пра экалагічныя, сацыяльныя ініцыятывы. Людзі сталі больш увагі звяртаць на стан навакольнага асяроддзя, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, сацыяльныя аб'екты, якія патрэбны менавіта для іх населеных пунктаў.

Да гэтай работы трэба далучаць насельніцтва, дэпутацкі корпус, мясцовыя ўлады, лічыць старшыня раённага Савета дэпутатаў Сяргей Сідарэвіч. Толькі тады атрымаецца эфектыўны прадукт. Са свайго боку ён паабяцаў, што раённы Савет гатовы прыняць удзел у абмеркаванні ініцыятыў. Тым больш што створаны і працуюць камісіі, якія ахопліваюць усе сферы жыццядзейнасці, таму спецыялістам будзе зручней ацаніць карысць тых ці іншых прапаноў.

— Калі ініцыятыва ідзе ад саміх людзей, то гэта заўжды ўспрымаецца лепш. А калі людзі самі ўнясуць пэўны ўклад у развіццё тэрыторыі, то яны будуць хваляваццa і за вынік, — падкрэсліў Сяргей Сідарэвіч.

З прапановамі па развіцці сваіх населеных пунктаў можна звяртацца ў Цэнтр сельскага развіцця.

**Таццяна СЕГЕН.**

ТЭМА ДНЯ

# НЕ ЗБІЦЦА НА ФАРМАЛІЗМ

**Мінулы год быў насычаны важнымі палітычнымі падзеямі і стаў своеасаблівым выпрабаваннем на трываласць для беларускай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай мадэлі развіцця. Мы пераадолелі фінансава-эканамічны крызіс, нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, выканалі заданні пяцігодкі, перажылі крызісны перыяд у адносінах з Расіяй, уступілі ў Мытны саюз, падпісалі і ратыфікавалі пагадненне аб адзінай эканамічнай прасторы. Усё гэта адкрывае новыя перспектывы для развіцця нашай краіны.**

Так распачаў сваё выступленне на адкрыцці выніковага пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль РУБІНАЎ**.

За перыяд свайго развіцця краіна нарасціла дастатковы эканамічны патэнцыял, падкрэсліў ён, аднак сёння стаяць новыя задачы, на дасягнутым спыняцца не збіраемся. Асноўныя кірункі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігодку прадугледжваюць вельмі высокія тэмпы росту эканомікі і дабрабыту людзей.Пастаўлена задача паскорыць развіццё ўсіх галін народнай гаспадаркі на базе самых сучасных тэхналогій. Галоўным рэсурсам павінны стаць ініцыятыва і крэатыўнасць. А значыць, Саветам усіх узроўняў, органам дзяржаўнага кіравання неабходна засяродзіцца на вырашэнні новых задач, пастаўленых Чацвёртым Усебеларускім народным сходам, сярод якіх — павышэнне прадукцыйнасці працы на аснове радыкальнай мадэрнізацыі ўсіх вытворчасцяў, істотнае зніжэнне энергазатрат і матэрыялаёмістасці, павышэнне экспартнай актыўнасці, прыцягненне прамых замежных інвестыцый.

Варта надаць новы імпульс рэгіянальнаму развіццю, звяртаючы асабліву ўвагу на адкрыццё новых высокаэфектыўных працоўных месцаў, павышэнне культуры вытворчасці і побыту, падрыхтоўку і замацаванне на месцах кваліфікаваных кадраў, развіццё прадпрымальніцтва і ініцыятывы.

Неабходна і далей узмацняць ролю Саветаў, выпрацаваць больш дасканалую сістэму прыцягнення грамадзян да вырашэння ўзнятых імі праблем.

— Дзейнасць Савета па ўзаемадзеянні ў мінулым годзе была скіравана на павышэнне эфектыўнасці працы органаў мясцовага самакіравання, аказанне канкрэтнай практычнай дапамогі ў вырашэнні найбольш вострых пытанняў. У асноўным, усё, што планавалася, мы выканалі. Наша ўзаемадзеянне з мясцовымі Саветамі дэпутатаў спрыяла своечасоваму ўнясенню неабходных змяненняў у дзейнае заканадаўства. Вельмі важным быў абмен напрацоўкамі, вывучэнне, абагульненне, распаўсюджванне станоўчага вопыту работы органаў мясцовага самакіравання.

## ...А воз і сёння там

За апошнія 5 гадоў Савет па ўзаемадзеянні зрабіў не адзін, а некалькі крокаў наперад, выказаў агульнае меркаванне **старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ПАНЦЮХОЎ**. Відавочна, што ў жыцці мясцовых Саветаў з'явіўся шэраг новых кірункаў, у пэўнай ступені ўзмацнілася сувязь з насельніцтвам, у лепшы бок змяніўся сам стыль работы, узрасла адказнасць кадраў.

— На пройдзеным шляху было набіта шмат сінякоў і шышак, хапала агрэхаў і сур'ёзных памылак, — падсумаваў Уладзімір Панцюхоў. — Мы яшчэ далёкія ад тых патрабаванняў, якія прад'яўляе да Саветаў і іх ролі ў грамадстве кіраўнік дзяржавы. У той жа час, мяркуючы па ацэнках і высновах калег, ва ўсіх пазітыўных працэсах,якія адбыліся ў 2010 годзе і адбываюцца цяпер, значная роля адводзіцца Савету па ўзаемадзеянні. Удасканальваючы формы і метады сваёй дзейнасці, Савет усё больш адчувальна і заўважна заяўляе аб сабе як аб партнёры мясцовых Саветаў. З іншага боку, ён выконвае ролю пасрэдніка паміж прадстаўнічай і выканаўчай уладай.

Уладзімір Панцюхоў падкрэсліў, што Савет па ўзаемадзеянні павінен стаць генератарам ідэй і прапаноў па ўсім спектры жыццядзейнасці нашага насельніцтва. У эпіцэнтры ўвагі павінны знаходзіцца пытанні навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання населеных пунктаў, развіццё грамадзянскіх ініцыятыў у гэтай галіне, выкананне сацыяльных стандартаў, падтрымка асабістых падсобных гаспадарак, аптымізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці. Далейшага ўдасканалення патрабуе дзейнасць структур, якія працуюць з людзьмі па прынцыпе «адно акно».

Пакуль не атрымалася да канца выканаць патрабаванні, якія прад'яўляе Указ № 21. У прыватнасці, у плане папаўнення бюджэтаў пярвічнага ўзроўню. Дадатковага вывучэння патрабуе пытанне перадачы спецыялізаваным арганізацыям дарог, могілак, калодзежаў, водanaпорных вежаў і іншых аб'ектаў.

— Што б там ні гаварылі, асабіста маё меркаванне такое: азначаныя пытанні вырашаны не да канца. Сёння назіраецца **пэўнае процістаянне паміж тымі, хто хоча перадаць, і тымі, хто не хоча прыняць**. Адны не вельмі намагаюцца перадаць, другія не вельмі імкнуцца прыняць. Той, хто паспеў, — перадаў калодзежы, дарогі і могілкі без пашпартоў на гэтыя аб'екты. А сёння дакументы для перадачы на адзін калодзеж, якому больш за 30 гадоў, каштуюць ад 300 тысяч рублёў і больш. Атрымліваецца замкнёнае кола: адны не маюць магчымасці вырабіць неабходную дакументацыю, другія не хочуць без яе прымаць аб'ект на баланс. І тыя, і другія маюць рацыю, «а воз і сёння там».

Таксама патрабуе вяртання да разгляду тэма стварэння аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». Паўнамоцтваў па яе ўкараненні, магчымасцяў па яе фінансаванні і нашага патэнцыялу па кантролі за яе выкананнем недастаткова. Да гэтай працы, на мой погляд, неабходна «прывязаць» выканаўчую ўладу і канкрэтна Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Інакш пытанне будзе прасоўвацца вельмі марудна, на нервах і не заўсёды якасна.

Не ўсюды яшчэ створаны ў аграгарадках участкі, ці філіялы ЖКГ, што таксама з'яўляецца вельмі сур'ёзным пытаннем, заўважыў Уладзімір Панцюхоў.

— У ранейшай рэдакцыі Закона «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле...» прапісана, што сельскі Савет павінен знаходзіцца ў цэнтры ці на тэрыторыі аграгарадка. На жаль, мы з гэтым пытаннем спазніліся, і будынкі многіх сельскіх Саветаў, прыведзеныя ў належны стан, размяшчаюцца па-за межамі аграгарадка. Зыходзячы з патрабаванняў закона, мы вымушаны перанесці Савет у аграгарадок, знайсці новае памяшканне, грошы на яго рамонт. А што будзе ў старым адрамантаваным памяшканні — ніхто не ведае. Магчыма, у новым праекце Закона «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні...» гэтую норму варта зрабіць не жорсткай, а толькі рэкамендацыйнай.

І яшчэ адно пытанне. Вучоныя вызначылі, што аптымальная колькасць жыхароў сельсавета павінна складаць 2 тысячы чалавек. Зыходзячы з гэтага, у Магілёўскай вобласці павінна быць усяго 38 сельскіх Саветаў. А сёння іх 183. Пры тым, што ў 2009-м годзе мы ліквідавалі 9 сельскіх Саветаў, у 17-і змянілі межы. Вышэйназваны дакумент у перспектыве паставіць нас у тупік, бо далейшае аб'яднанне не заўсёды будзе на карысць мясцовых жыхароў. Ёсць такія сельсаветы, дзе ўсяго 10-12 населеных пунктаў, але адлегласці паміж імі каласальныя — 30, 40, 60 км. Гэта абавязкова трэба ўлічваць пры разглядзе праекта згаданага закона.

## Вынікі ёсць

— Для паляпшэння якасці работы мясцовых Саветаў па вырашэнні жыццёва важных пытанняў насельніцтва мы намагаемся актыўна задзейнічаць не толькі дэпутатаў, але і само насельніцтва, — падзялілася вопытам **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**. — Рэгулярна праводзім выязныя сесіі, каб паказаць рэальную работу на месцах, абагульніць станоўчы вопыт. У сесіях абласнога Савета заўсёды бяруць удзел старэйшыны вёсак, дэпутаты сельскіх, раённых Саветаў. Падчас удзелу ў сесіі аблсавета яны адчуваюць і сваю адказнасць, і ўвагу да сябе, а таксама маюць магчымасць задаваць тыя пытанні, якія іх хвалююць.

З 2007 года ў вобласці праводзяцца рэгіянальныя сходы дэпутатаў. Апошнія прайшлі адразу пасля Чацвёртага Усебеларускага народнага сходу. На іх мы абмеркавалі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў кожным раёне, акрэслілі планы на наступную пяцігодку.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# БЕЗ ПРЫЦЯГНЕННЯ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ

**На тэрыторыі Юркевіцкага сельсавета Жыткавіцкага раёна месціцца 8 населеных пунктаў, дзе пражывае крыху менш за тысячу чалавек. Толькі ў двух, пасёлку Азёрны і вёсцы Баравая, большасць насельніцтва — людзі працаздольнага ўзросту. У астатніх асноўны кантынгент жыхароў складаюць пенсіянеры. Акрамя таго, на тэрыторыі сельсавета няма СВК. Адзінае буйное прамысловае прадпрыемства — рыбгас «Белае». Ёсць яшчэ два лясніцтвы і сацыяльныя ўстановы.**

— Магчыма, усё гэта і прымусіла нас актыўна развіваць мясцовае самакіраванне, — зрабіла выснову **старшыня Юркевіцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена ШПАКЕВІЧ**. — Адразу пасля выбараў у мясцовыя Саветы мы стварылі пастаянныя дэпутацкія групы, кожны наш дэпутат ведае, якія пытанні трэба курыраваць на працягу ўсяго склікання. Сёння ўжо ёсць шмат станоўчых прыкладаў выкарыстання пісьмовых зваротаў і запытаў дэпутатаў у вышэйшыя структуры па вырашэнні набалелых пытанняў нашай тэрыторыі.

Старшыня Савета ўзгадала «разынку» мясцовых краявідаў — возера Белае, размешчанае сярод маляўнічых лясоў. Яно стала домам для 32 відаў млекакормячых і птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Возера карыстаецца вялікай папулярнасцю як месца адпачынку ў жыхароў не толькі Жыткавіцкага, але і суседніх раёнаў. Летам за дзень сюды прыязджае да сотні аўтамабіляў. Дарога да возера ляжыць праз тры населеныя пункты сельсавета, што выклікае нязручнасці, а часам і пагрозу для жыцця мясцовых жыхароў.

— Едуць, як правіла, на вялікай хуткасці, а назад часам і нецвярозыя, — патлумачыла Алена Іванаўна. — ДАІ нам вельмі дапамагае, але ж немагчыма выставіць інспектара на кожным кіламетры. Каб неяк выправіць сітуацыю, дэпутат сельскага Савета і старэйшына адной з вёсак выступілі з ініцыятывай: устанавіць на гэтай дарозе знак абмежавання хуткасці. Дзякуючы ім абмежавальны знак быў устаноўлены.

Яшчэ два нашы дэпутаты звярнуліся ў раённы аддзел адукацыі з просьбай аб адкрыцці ў Юркевіцкай школе дзіцячага садка. Гэта для нас таксама было балючым пытаннем... Будаўнічыя работы па садку ўжо завершаны. Цяпер маладыя сем'і маюць магчымасць уладкаваць сваё дзіця ў школу-сад, а раней многія вымушаны былі па гэтай прычыне ад нас з'язджаць.

Больш падрабязна старшыня спынілася на рабоце па ўвекавечанні памяці землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У вёсцы Лагвошчы некалі стаяў драўляны абеліск, які і абеліскам назваць было цяжка. Стары драўляны знак памяці. Зноў жа па прапанове мясцовага дэпутата драўляны знак знеслі, а замест яго недалёка ўстанавілі новы гранітны абеліск з прозвішчамі загінулых землякоў. Сродкі на гэта выдаткаваў сельскі Савет.

— Мы ўстанавілі новы абеліск, але толькі ім не абмежаваліся. Аказалася, што ў многіх населеных пунктах сельсавета невядома месца пахавання загінулых землякоў. Сёння мы практычна завяршылі работу па ўстаноўцы такіх абеліскаў у буйных вёсках. Памятаю, напярэдадні 9 мая, калі заканчвалі класці плітку ля абеліска ў вёсцы Баравая (грошы на яго выдаткаваў раён), пад'ехаў на веласіпедзе пенсіянер, мясцовы жыхар, з букецікам нарцысаў у руках. Літаральна за месяц да таго мы ўстанавілі, што яго брат, які таксама нарадзіўся ў гэтай вёсцы, загінуў і пахаваны ў Калінінградзе. Яго імя і прозвішча таксама змешчана на нашым абеліску. Пенсіянер паклаў нарцысы да абеліска са словамі: «Ну што, браток, і ты вярнуўся ў гэтую вёску». І заплакаў...

На адкрыццё абеліска прыехалі жанчыны з Жыткавічаў з унукамі і праўнукамі, якія казалі моладзі: «Тут твой дзядуля ляжыць». Людзі ўспрынялі абеліск як месца пахавання, пастаянна прыносяць сюды букеты. Мясцовыя жыхары па ўласнай ініцыятыве высадзілі ля абеліска жывыя кветкі і дрэвы — клёны, бярозы і рабіны, чые чырвоныя гронкі павінны сімвалізаваць кроў ахвяр вайны. Вяскоўцы самі займаюцца добраўпарадкаваннем абеліскаў і могілак на тэрыторыі сельсавета. Дарэчы, сродкі на металічную агароджу часткова выдаткаваў бюджэт, часткова сабралі мясцовыя жыхары. Яны ж займаліся і ўстаноўкай. Уласны прыклад паказваюць самі дэпутаты. Калі мы займаліся могілкамі ў вёсцы Лагвошчы, на работу выйшлі амаль усе працаздольныя жыхары. Наш дэпутат Сцяпан Богуш асабіста ездзіў да кожнага і заахвочваў прыняць удзел у агульнай справе.

Дзякуючы агульнай працы дэпутацкага корпусу сельскага Савета, старэйшын і саміх жыхароў у пасёлку Азёрны была добраўпарадкавана магіла мясцовай расстралянай яўрэйскай сям'і з шасці чалавек — бабулі, маці і 4 дзетак, самаму малодшаму з якіх не споўнілася яшчэ і года.

— Гэтай вясной мы мяркуем пакласці тут плітку, а даглядаць магілу выказалі жаданне дзве мясцовыя жыхаркі. Сельскі Савет разам з органамі грамадскага самакіравання ўвогуле надае вялікую ўвагу таму, каб ва ўсіх пачынаннях бралі ўдзел жыхары. Яны павінны зразумець, што некаторыя пытанні можна вырашыць уласнымі сіламі, без умяшання вышэйшых арганізацый. Так, у 2010 годзе мы паўдзельнічалі ў двух праектах па лініі ПРААН: агульнымі намаганнямі пабудавалі ў пасёлку Азёрны дзіцячую пляцоўку «Астравок дзяцінства» (аналагаў якой няма ва ўсім раёне) і адрамантавалі дзіцячы садок у Юркевічах.

Значную падтрымку дэпутатам аказваюць старэйшыны. Іх добра ведаюць на вёсцы. Карыснымі з'яўляюцца сумесныя пасяджэнні старэйшын, якія збіраюцца па меры неабходнасці (напрыклад, калі трэба правесці свята вёскі, дапамагчы наладзіць працу ўчастковага). На такія пасяджэнні абавязкова запрашаюцца дэпутаты, члены сельвыканкама, якія курыруюць вынесенае на разгляд пытанне, а таксама іншыя зацікаўленыя асобы.

Старэйшыны вёсак лепш за ўсіх ведаюць, якую канкрэтна падтрымку трэба аказаць свайму насельніцтву. Так, для дапамогі ў развіцці асабістых падсобных гаспадарак старэйшыны — пры падтрымцы сельскага Савета, які выступіў каардынатарам, — арганізавалі замену насеннай бульбы. Гэта быў вялікі аб'ём работы, паколькі трэба было зайсці ў кожную хату, з кожным пагутарыць. Людзі прасілі замяніць не адзін, а некалькі гатункаў. Старэйшыны самі сабралі грошы, самі з'ездзілі па насенне і самі развезлі яго жыхарам. За 4 гады было заменена 6 гатункаў бульбы.

— Цяпер у нас нават тыя сем'і, якія раней ніколі не мелі добрых ураджаяў, ганарацца, што выдатную бульбу ў сябе вырасцілі.

Для вывучэння зваротаў грамадзян сельскі Савет выкарыстоўвае розныя формы. На працягу 14 гадоў у мясцовым Цэнтры культуры рэгулярна ладзяцца арганізацыйныя мерапрыемствы.

— З усіх 8 населеных пунктаў мы прывозім сюды прадстаўнікоў усіх ільготных груп насельніцтва (інвалідаў I, II групы, ветэранаў, вязняў вайны, адзінокіх састарэлых), куды адначасова запрашаем і раённыя службы. Зразумела, што інваліды ці ветэраны самі не могуць прыехаць у райцэнтр, а тут, на месцы, яны маюць магчымасць задаць спецыялістам усе пытанні, якія іх хвалююць. Старэйшыны, Савет жанчын і дэпутаты рыхтуюць салодкія сталы і канцэрт. Адзначу, што ўсё гэта робіцца без прыцягнення бюджэтных сродкаў. На такіх мерапрыемствах людзі могуць і душой адпачыць, і сустрэцца з прадстаўнікамі раённых службаў. Гэта дае станоўчыя вынікі, бо за перыяд з 2007 па 2010 год з тэрыторыі нашага Савета ні ў Адміністрацыю Прэзідэнта, ні ў Гомельскі аблвыканкам не паступіла ніводнай скаргі.

Для абслугоўвання дзвюх нашых маланаселеных вёсак, якія месцяцца па суседстве (Пяшчанікі і Падвосце), мы стварылі — таксама без прыцягнення бюджэтных сродкаў — сацыяльны пункт. Наш дэпутат знайшла дом, які пустуе, дамовілася са спадчыннікамі, якія бескарысліва перадалі дом для патрэб мясцовых жыхароў. Пярвічная арганізацыя Савета жанчын, дэпутат і жыхары двух згаданых населеных пунктаў уласнымі сіламі прывялі ў парадак і зямельны ўчастак, і сам дом. Там сёння праводзяцца сустрэчы з работнікамі сельскага Савета, вядзе прыём мясцовы дэпутат, прыязджаюць работнікі медыцыны і іншых службаў.

У сістэме мясцовага самакіравання Алена Іванаўна ўжо 33 гады. Яна на ўласным вопыце бачыць, якія моцныя змяненні адбыліся ў адносінах да Саветаў за апошні час. Сельскія Саветы дэпутатаў пацвердзілі сваю жыццядзейнасць.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# НЕ ЗБІЦЦА НА ФАРМАЛІЗМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Святлана Герасімовіч падкрэсліла, што такія сходы — не сесіі. Іх праводзіць старшыня раённага Савета з удзелам усіх дэпутатаў раённага, сельскіх Саветаў пэўнай тэрыторыі, а таксама выканаўчай улады. На гэтых сходах старшыня райвыканкама трымае справаздачу перад дэпутатамі наконт таго, што робіцца на тэрыторыі рэгіёна.

— Цяпер мы пайшлі далей. На тэрыторыі сельсавета праводзім сход актыву, у якім бяруць удзел дэпутаты сельскага Савета, старэйшыны, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, размешчаных на гэтай тэрыторыі. Там таксама абмяркоўваюцца праблемы пэўнага сельсавета ў разрэзе асобных вёсак, вызначаецца, што трэба зрабіць у 2011 годзе, якім канкрэтна чынам будуць вырашацца пытанні і г.д. Мы толькі распачалі работу ў гэтым ракурсе, але я бачу, што вынікі ўжо ёсць.

Мы ўжо не першы год праводзім у вобласці Дні дэпутата, у якіх задзейнічаны народныя абраннікі ўсіх узроўняў. У тым ліку і члены Савета Рэспублікі, якія выязджаюць у сваю акругу, бываюць у сем'ях, працоўных калектывах, сустракаюцца з выбаршчыкамі, цікавяцца праблемамі, якія там узнікаюць, і намагаюцца дапамагчы іх вырашыць.

Святлана Герасімовіч падкрэсліла, што формаў работы дэпутатаў шмат, але самае галоўнае — іх змест. Важна, каб кожны дэпутат быў задзейнічаны і не забываў пра тое, што ён — дэпутат.

— Па выніках маніторынгу Адміністрацыі Прэзідэнта, 121 чалавек у вобласці панёс пакаранне за нездавальняючую работу са зваротамі грамадзян. У тым ліку і дэпутаты. Мы абмеркавалі сітуацыю, зрабілі пэўныя высновы. Для таго, каб папярэдзіць многія звароты грамадзян, у будынках сельскіх Саветаў устанаўліваюцца стэнды, дзе пазначана, што канкрэтна ў бліжэйшую пяцігодку будзе зроблена на гэтай тэрыторыі: што адрамантавана, што заасфальтавана, у які тэрмін, хто адказны.

Дзве трэція старшынь райсаветаў і трэць старшынь сельскіх і пасялковых Саветаў вобласці — навічкі. З імі праводзіцца абавязковая вучоба. Вельмі важна і карысна абменьвацца вопытам з калегамі. Дзякуючы Савету па ўзаемадзеянні, мы пабывалі ва ўсіх абласцях, пабачылі шмат цікавых напрацовак, якія цяпер выкарыстоўваем у сваёй рабоце.

## Планы распрацаваны, трэба іх выконваць

Саветы ўсіх узроўняў — гэта аснова нашага народаўладдзя, падкрэсліў напрыканцы пасяджэння Анатоль Рубінаў. Яны з'яўляюцца злучальным звяном паміж выканаўчай уладай і народам. Гэта народнае прадстаўніцтва, якое прызвана вырашаць пытанні мясцовага насельніцтва.

— Стратэгія краіны на пяцігодку вызначана. Арыенціры пастаўлены, планы распрацаваны. Цяпер трэба іх выконваць. Наша задача — уважліва сачыць, каб гэтыя планы не засталіся на паперы. Саветы — галоўныя, хто адказвае за сацыяльную стабільнасць грамадства, бо яны бліжэй за ўсё да насельніцтва. Пакуль што ў гэтай частцы ёсць недапрацоўкі. Савет па ўзаемадзеянні сваю функцыю выконвае. Яго стварэнне было правільным і разумным рашэннем. Цяпер самае галоўнае — не збівацца на фармалізм.

Адказваючы на пытанні «Звязды», Анатоль Мікалаевіч падкрэсліў, што нарматыўна-прававая база ў рэспубліцы сёння дазваляе вырашаць усе мясцовыя праблемы. Сур'ёзных перашкод заканадаўчага ўзроўню, якія б тармазілі развіццё краіны, няма. Часам узнікаюць складанасці па нейкіх прыватных пытаннях, але яны аператыўна адпрацоўваюцца.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## Праследавалі і затрымалі

**У паляўнічых угоддзях Шчучынскага раёна вадзіцель аўтамабіля «Нісан-Патрол» праігнараваў патрабаванне работнікаў Гродзенскай аблінспекцыі спыніцца.**

У выніку праследавання аўто затрымалі паблізу вёскі Новы Двор. Двое беспрацоўных і вадзіцель прадпрыемства «Прадбуд», што былі ў салоне, прад'явілі дакументы на права палявання на пушныя віды паляўнічай жывёлы. Аднак падчас агляду ляснога масіву, адкуль рухалася аўтамашына, былі знойдзены два заплечнікі з дзічынай, а таксама месца разбору казулі і дзіка. Нанесены ўрон склаў 4,2 мільёна рублёў. Шчучынскім РАУС заведзена крымінальная справа.

## Лес — сусветнае багацце

**Па рашэнні Генеральнай асамблеі ААН сёлетні год абвешчаны Міжнародным годам лясоў. Мэта — падтрымаць намаганні па вядзенні ўстойлівага лесакарыстання ва ўсім свеце. Год лясоў распачнецца на дзявятай сесіі Ляснога форуму ААН, якая пройдзе ў Нью-Ёрку 4 лютага.**

Міністэрствам лясной гаспадаркі нашай краіны ўжо распрацаваны і ўзгоднены з усімі зацікаўленымі ведамствамі план мерапрыемстваў па правядзенні ў Беларусі Міжнароднага года лясоў. Дакумент уступіць у сілу пасля таго, як будзе ўхвалены Саветам Міністраў.

Да ведама: агульная плошча лясоў свету перавышае 3,4 мільярда гектараў (27 працэнтаў ад плошчы зямной сушы). Агульны запас драўніны па 166 краінах, на тэрыторыі якіх расце 99 працэнтаў сусветных лясоў, складае каля 390 мільярдаў кубічных метраў. Найбольшы запас драўніны на адным гектары адзначаны ў Гватэмале — 355 кубічных метраў. У Беларусі гэты паказчык у 2007 годзе складаў 179 кубаметраў, а да канца 2010 года — ужо 194 кубічных метры. Па разліках спецыялістаў, да 2015 года ён перавысіць 200 кубаметраў на адзін гектар.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЖЫЦЦЁ... У КАМП'ЮТАРНЫХ ПАПКАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Камп'ютарызацыя дайшла і да глыбінкі, — ганарыцца **старшыня Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў Раіса САЎЧАНКА**. — У параўнанні з мінулымі часамі розніца істотная, і людзі яе адчулі. Хто ж марыў пра такое, калі людзі стаялі ў чэргах і ўсюды карысталіся старымі лічыльнікамі? А цяпер і я магу атрымаць усе звесткі пра дзейнасць сельсаветаў праз свой камп'ютар.

Калі ў вяскоўцаў пытаюцца, куды далей пойдзе прагрэс, то яны адразу кажуць: «У нас будзе, як у горадзе». У аграгарадку Белая Дуброва за апошнія гады адбыліся сапраўды адчувальныя змены: новае жыллё, забаўляльныя ўстановы, лазня, той жа сельскі Савет з камп'ютарамі.

— Так, для працы ў нас створаны ўсе ўмовы, — лічыць Міхаіл Грыбачоў. — Добры будынак, абсталяванне, камп'ютары, аўтамабіль. Трэба толькі працаваць для людзей, што мы і робім.

— Можна не цягацца ў Касцюковічы, за 16 кіламетраў, у тым ліку і па тыя даведкі, — тлумачаць мясцовыя жыхаркі.

Што ж датычыцца прагрэсу ў канкрэтнай сферы, то мяркуецца, што хутка знікне як папера, так і неабходнасць хадзіць па дакументы асабіста. Можа, сёння гэта і падаецца фантастыкай, але людзі ў касцюковіцкай глыбінцы ўпэўнены, што хутка ўсе даведкі па камп'ютарных сетках будуць перадавацца з адной установы ў іншую паводле патрабавання людзей. Чаму ж не? Вельмі верагодна!

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**
*Касцюковіцкі раён.*

## З ВЕЛАСІПЕДА — НА СКУТАР

**На Міншчыне сацыяльным работнікам выдадуць новы від транспарту.**

Як расказала начальнік упраўлення Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Вера Карэлава, большасць пажылых людзей і інвалідаў жывуць у аддаленых ад райцэнтраў вёсках, таму дабрацца туды бывае няпроста. А неабходна пастаянна закупляць тавары, лякарствы і своечасова дастаўляць іх падапечным. Такіх жа ў кожнага сацработніка некалькі. Можна, вядома, пакруціць педалі службовага веласіпеда, але на ім у снежныя заносы або галалёдзіцу далёка не паедзеш. Выхад прапанавалі ў Мядзельскім райвыканкаме: забяспечыць сацыяльных работнікаў больш сучасным і зручным відам транспарту — скутарамі. У Мінаблвыканкаме ініцыятыву падтрымалі, мяркуючы, што рэалізаваць яе трэба і ў іншых рэгіёнах Міншчыны. Ужо прынята рашэнне набыць 12 скутараў за кошт сродкаў рэзервовага фонду.

**Любоў ЯГОРАНКАВА,**
*«Мінск—Навіны».*


# АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ в г. КОБРИНЕ 11 марта 2011 года

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
### 11 марта 2011 года в 11.00

| № лота | Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства: Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер/ срок аренды/арендодатель | Целевое назначение земельного участка | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская область, Кобринский район, пос. Фруктовый, ул. Радужная/ кадастровый номер 124380404601000214/ площадь участка 0,0453 га/ срок аренды 10 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Установка и обслуживание торгового павильона | Прочие неиспользуемые земли. На всей площади имеются ограничения в использовании земли в водоохранной зоне вне прибрежной полосы р. Мухавец. | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>- возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме:<br>по лоту № 1 – 1 142 520 руб.;<br>по лоту № 2 – 1 227 680 руб., убытков, причиняемых КСУП «Племенной завод Дружба» изъятием земельного участка, в сумме 2 664 780 руб. и потерь сельскохозяйственного производства в сумме 14 933 600 руб.;<br>и расходов на публикацию данного извещения;<br>- заключение с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него;<br>- начало освоения земельного участка – после утверждения проектно-сметной документации на строительство объектов, но не позднее 2-х лет с даты государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- обеспечение целевого использования земельного участка в течение срока аренды;<br>- осуществление в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией установки павильона и благоустройства прилегающей территории (по лоту № 1), строительства и благоустройства прилегающей территории, вынос подземных коммуникаций с территории застройки в соответствии с техусловиями их владельцев (по лоту № 2). | 1 994 000 | 199 500 |
| 2 | Брестская область, Кобринский район, Городецкий сельсовет, дер. Кустовичи, на 83 км автомобильной дороги М-1/Е-30 Брест-Минск-граница Российской Федерации (право)/кадастровый номер 124381200001000055/ площадь участка 0,9000 га/ срок аренды 50 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Строительство автозаправочной станции | Пахотные земли. На площади 0,0200 га имеются ограничения в использовании земли в охранной зоне подземных кабельных линий. | | 102 600 | 10 500 |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ
### 11 марта 2011 года в 11.15

| № лота | Сведения о предмете аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства: Адрес земельного участка/ кадастровый номер/размер/ срок аренды/арендодатель | Целевое назначение земельного участка | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Фабричная (участок № 2)/ кадастровый номер 124350100001006436/ площадь участка 0,0151 га/ срок аренды 10 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Установка и обслуживание торгового павильона | Прочие неиспользуемые земли. Ограничений в использовании земли нет. | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>- возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме:<br>по лоту № 1 – 1 136 960 руб.;<br>по лоту № 2 – 1 279 290 руб.;<br>и расходов на публикацию данного извещения;<br>- заключение с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него;<br>- обеспечение целевого использования земельного участка в течение срока аренды;<br>- осуществление установки павильона и благоустройства прилегающей территории в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией но не позднее 2-х лет с даты регистрации прав на земельный участок. | 1 002 000 | 100 200 |
| 2 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Дзержинского (район дома № 119)/ кадастровый номер 124350100001006400/ площадь участка 0,0466 га/ срок аренды 10 лет/ арендодатель – Кобринский райисполком | Установка и обслуживание торгового павильона | Прочие неиспользуемые земли. На площади 0,0017 га имеются ограничения в использовании земли в охранной зоне канализационного коллектора и на площади 0,0102 га в охранной зоне газопровода высокого давления. | | 6 984 670 | 698 470 |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ
### 11 марта 2011 года в 11.30

| № лота | Сведения о предмете аукциона по продаже земельного участка в частную собственность: Адрес земельного участка/кадастровый номер/размер | Целевое назначение земельного участка | Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | Условия предоставления земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Рокоссовского, 4/ кадастровый номер 124350100001006430/ площадь участка 0,1500 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | - внесение победителем аукциона платы за земельный участок в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка;<br>- возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в сумме:<br>по лоту № 1 – 712 300 руб.;<br>по лоту № 2 – 1 038 620 руб.;<br>по лоту № 3 – 679 780 руб.;<br>по лоту № 4 – 679 780 руб.;<br>по лоту № 5 – 679 780 руб.,<br>и расходов на публикацию данного извещения;<br>- осуществление в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении участка государственной регистрации прав на него;<br>- к строительству жилых домов и хозяйственных построек приступить после получения разрешения на их строительство, но не позднее одного года с момента регистрации прав на земельный участок;<br>- снять на предоставляемом земельном участке плодородный слой почвы под строящимися зданиями и использовать его для благоустройства придомовой территории. | 12 120 570 | 1 212 060 |
| 2 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 6/ кадастровый номер 124350100001006427/ площадь участка 0,1314 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 10 617 630 | 1 061 770 |
| 3 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 8/ кадастровый номер 124350100001006423/ площадь участка 0,1290 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 10 423 700 | 1 042 370 |
| 4 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 10/ кадастровый номер 124350100001006424/ площадь участка 0,1343 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 10 851 950 | 1 085 200 |
| 5 | Брестская область, г. Кобрин, ул. Гусарская, 12/ кадастровый номер 124350100001006426/ площадь участка 0,1382 га | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. | Прочие неиспользуемые земли.* Ограничений в использовании земли нет. | | 11 167 090 | 1 116 710 |

** Инженерные коммуникации на участках отсутствуют.*

**Аукционные торги состоятся 11 марта 2011 года** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1 этаж.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

копию платежного поручения (с отметкой банка отправителя об исполнении) о внесении задатка на расчетный счет 3632002160014 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – по 9 марта 2011 г. включительно.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками на местности.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Аукционные торги признаются не состоявшимися в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае райисполком в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении земельного участка с увеличением его начальной цены на 5 %).

**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 404 с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 9 марта 2011 г. включительно. Тел. для справок 8(01642) 2 28 11, 2 33 68.**
**Полная информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by**



МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# РОДНАЯ НОША




# Краіна здароўя

Выпуск № 5 (241)

## «АХОВА ЗДАРОЎЯ БЕЛАРУСІ — 2011» ПРОЙДЗЕ Ў МІНСКУ 29 САКАВІКА — 1 КРАСАВІКА

**XVIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Ахова здароўя Беларусі — 2011» пройдзе ў Мінску 29 сакавіка — 1 красавіка, паведаміла БЕЛТА менеджар выстаўкі Ірына Клімчанка.**

Мэта выстаўкі — дэманстрацыя вопыту вядучых фірм свету і айчынных вытворцаў лекавых прэпаратаў, медыцынскай касметыкі, оптыкі, тэхнікі і тавараў медыцынскага прызначэння, лабараторнага і дыягнастычнага абсталявання, стаматалагічнага абсталявання. Можна з упэўненасцю сказаць, што правядзенне выстаўкі «Ахова здароўя Беларусі» стала добрай традыцыяй. Многія фірмы ўжо не першы раз прадстаўляюць сваю прадукцыю ў Мінску. 70 працэнтаў з іх — пастаянныя ўдзельнікі. Мінулагодні форум стаў самым маштабным за гады яго правядзення. Удзел у выстаўцы прынялі звыш 400 фірм з 17 краін. Сярод іх Беларусь, Украіна, Расія, Балгарыя, Германія, Італія, Кітай, Казахстан, Латвія, Літва і інш.

У гэтым годзе заяўкі на ўдзел падалі ўжо больш за 100 фірм з 14 краін. «Разам з тым колькасць удзельнікаў будзе павялічвацца, таму што рэгістрацыя яшчэ прадаўжаецца», — адзначыла Ірына Клімчанка.

Да ведама

## ШТО КАРЫСНА ДЛЯ СТУПНІ?

**БОЛЬШАСЦІ з нас ад нараджэння дасталіся здаровыя ногі. І ад нас саміх залежыць, ці захаваем мы іх у парадку да старасці. Ступні — падмурак нашага цела ў прамым і пераносным сэнсе. Яны нясуць нагрузку большую, чым іншыя часткі цела.**



Каб вытрымаць такія нагрузкі, як хада, бег, скачкі і г.д., патрэбна моцная, гнуткая, пругкая ступня. Ступня выконвае балансавальную функцыю, дапамагаючы целу захоўваць раўнавагу. Дзякуючы сваім падоўжнаму і папярочнаму зводам ступня яшчэ і амартызуе нагрузкі, засцерагаючы ад іх размешчаныя вышэй каленны і тазасцегнавы суставы, а таксама пазваночны слуп. У падтрыманні зводаў ступні вялікая роля належыць падэшвенным апанеўрозам (тоўстыя звязкі, якія злучаюць пальцы нагі з пяткай) і мышцам. Калі звод ступні слабее, развіваецца падоўжная плоскаступнёвасць.

На жаль, ад плоскаступнёвасці цяпер пакутуе кожны пяты школьнік, а з узростам распаўсюджанасць гэтай немачы і звязаных з ёю захворванняў ступняў прыкметна павялічваецца. Таму бацькі павінны падбіраць зручны абутак дзецям ужо з самага ранняга ўзросту. Не эканоміць на дзіцячым абутку, выбіраць высакаякасны, які адпавядае наступным патрабаванням:

- Абутак павінен быць пашыты з натуральнай, эластычнай скуры. Абутак з заменнікаў скуры дае ўсадку, таму да канца дня, асабліва пасля дажджу і хады па лужынах, ступня дзіцяці можа аказацца моцна сціснутай.
- Ідэальная падэшва абутку для малога павінна быць гнуткай і добра амартызаваць. Лепшы матэрыял для яе — натуральны каўчук. Вазьміце чаравік і сагніце падэшву рукамі, сцісніце пальцамі яе таўшчыню. Не згінаецца, не спружыніць — не купляйце. Нават па кватэры дзеткам шкодна бегаць у тапачках-цацках з матэрыі: пятка дзіцяці падчас бегу моцна ўдараецца аб падлогу, анучная падэшва не ў сілах змякчыць такія ўдары. Гэта пагражае пашкоджаннем парасткавай зоны пятачных касцей.
- Абавязковы атрыбут дзіцячага абутку — абцасік. Ён неабходны для правільнага фарміравання ступні. Недапушчальны абутак з адкрытай пяткай (сандалі). Пры бегу пятка дзіцяці ёрзае з боку ў бок і расхістваецца. Гэта пагражае развіццём дэфармацый ступні.
- Носік чаравічка павінен быць мяккім і эластычным (не сціскаць пальцы), але і не занадта прасторным: калі пасля націскання пальцам на носік застаецца ўвагнутасць, чаравік не падыходзіць.
- Вусцілка і падкладка павінны быць роўнымі, гладкімі. Нават невялікія няроўнасці, грубыя швы, засохлы клей могуць выклікаць пацёртасці, мазалі.
- Вялікі вораг ступні дзяўчыны-падлетка — модны абутак. Высачэзныя і касыя, як Пізанская вежа, абцасы, падэшвы-платформы таўшчынёй з гамбургер, іншыя «прыбамбасы» робяць модны абутак непрымальным з пункту гледжання артапедаў.

Высокі абцас «вінаваты» ў тым, што большая частка вагі цела дзяўчыны пачынае ціснуць на пярэдні аддзел ступні, распластваючы яго. Справы становяцца зусім сумнымі, калі вузкі носік туфліка сціскае і скрыўляе пальцы. Наступства гэтага — утварэнне вальгуснага першага пальца, з'яўленне натоптышаў на падэшвеннай частцы, малаткападобных пальцаў і іншых дэфармацый. У сярэднім аддзеле ступня як быццам ломіцца. Пры гэтым пакутуюць суставы і звязкі.

Тоўстая, нягнуткая, цвёрдая падэшва выключае з работы падчас хады суставы і мышцы ступні, што прыводзіць да іх аслаблення і развіцця падоўжнай плоскаступнёвасці. Слабыя звязкі і мышцы не могуць утрымаць на месцы пятачную косць, і яна адхіляецца вонкі. Так фарміруецца плоска-вальгусная ступня. Безумоўна, такія дэфармацыі прыводзяць да з'яўлення боляў у ступні і галёнцы. З часам могуць развіцца захворванні каленнага, тазасцегнавога суставаў.

Лепшы спосаб прафілактыкі плоскаступнёвасці і звязаных з ёю захворванняў ступняў — карыстацца правільна сканструяваным абуткам, выконваць спецыяльныя практыкаванні для захавання гнуткасці суставаў ступняў і ўмацавання іх мышцаў і хадзіць басаною, хоць бы дома. А як прыемна хадзіць басанож па рыхлай зямлі, пяску, мяккай траўцы! На ступні знаходзіцца вялікая колькасць рэцэптараў, якія пры хадзе басанож пачынаюць актыўна працаваць і стымуляваць звязаныя з імі ўнутраныя органы. Хада басанож дапамагае павысіць імунную абарону арганізма ад прастудных захворванняў. Нарэшце, суставы і мышцы ступні, не сціснутыя абуткам, пачынаюць нармальна працаваць. Толькі пры хадзе басанож ступні працуюць так, як ім гэта наканавана самой прыродай.

*Перад тым як пачаць рабіць практыкаванні для паляпшэння функцыі ступні, варта пратэставаць сябе, вызначыць магчымасці сваіх ступняў.*

***Тэст «Гусеніца»*** ацэньвае сілу і вынослівасць падэшвенных мышцаў. Устаньце басанож (можна ў шкарпэтках) на гладкую падлогу (лінолеум, паркет), падраўняйце наскі. Адначасова згінайце пальцы ступняў і, не адрываючы пяткі ад падлогі, рухайцеся наперад. Вымерайце сантыметровай стужкай адлегласць, якую вы прайшлі «гусенічным ходам» за 20 секунд. Калі вам ад 10 да 50 гадоў і ў вас дужыя мышцы ступняў, вынік павінен быць не менш як 30 см.

***Тэст на гнуткасць.*** Паспрабуйце прайсці на насках у поўным прысядзе некалькі метраў. Калі ў вас гнуткія каленныя і галёнкаступнёвыя суставы, вы не адчуеце цяжкасцяў.

***Тэст на раўнавагу.*** Часцей за ўсё падаюць і атрымліваюць траўмы зімой, падчас галалёду, пажылыя людзі, у якіх парушаная функцыя раўнавагі. Паспрабуйце, стоячы на адной назе, надзець шкарпэтку на другую. Калі балансавальная функцыя ступняў захаваная, вы лёгка выканаеце гэты тэст.

***Тэст на сілу мышцаў галёнкі.*** Наступіце пярэднім аддзелам ступні на край прыступкі, апусціце пятку да дотыку да падлогі. Трымаючыся адной рукой за сцяну (для раўнавагі), паднімайцеся на насок. Падлічыце, колькі разоў вы зможаце зрабіць гэтае практыкаванне «да адмовы». Калі вынік будзе не менш як 20 разоў, у вас дужыя мышцы галёнкі.

Вынікі тэстаў дапамогуць вам выбраць практыкаванні для развіцця адсталых фізічных якасцяў: трэба выконваць менавіта тыя практыкаванні, якія ў вас атрымліваюцца горш. Праз 2 тыдні штодзённых трэніровак паўтарыце тэсты, і вы пераканаецеся, што дабіліся прагрэсу.

Якія ж практыкаванні трэба рабіць, каб захаваць ступні здаровымі? Акрамя тых, якія пакладзены ў аснову апісаных вышэй тэстаў, рэкамендуюцца наступныя:

**Практыкаванне 1.** Седзячы на крэсле, пастаўце ступню на край вялікай, тоўстай кнігі. Сціскаючы пальцы, абхапляйце край кнігі.

**Практыкаванне 2.** Захоплівайце пальцамі і пераносьце на іншае месца дробныя каменьчыкі або гумку.

**Практыкаванне 3.** «Мішка касалапы». Пахадзіце па пакоі на вонкавых зводах ступняў, сціснуўшы пры гэтым пальцы. Можна гэтае і наступнае, чацвёртае практыкаванне рабіць на дыванку з паралону, эластычнае супраціўленне якога рэфлекторна стымулюе падэшвенныя мышцы.

**Практыкаванне 4.** Хада на насках са спружыністымі пагойдваннямі на кожным кроку.

**Практыкаванне 5.** Сядзьце на крэсла і пакладзіце ступні на мячык. Пакачайце мяч, моцна націскаючы на яго ступнямі. Аналагічнае практыкаванне можна рабіць з механічным масажорам (ён падобны на старадаўнія бухгалтарскія лічыльнікі) або з драўлянай палкай (качалкай), разаграваючы ступні да адчування цеплыні.

**Практыкаванне 6.** Рытмічна сціскайце падэшвай ступняў гумовы мячык.

### ШТО КАРЫСНА, А ШТО ШКОДНА ДЛЯ СТУПНІ?

- Карысна хадзіць басанож па рыхлай зямлі, пяску, мяккай траве. Шкодна хадзіць без абутку па цвёрдай, камяністай глебе, асфальце.
- Купляйце хатні абутак з убудаваным супінатарам калодкі і спецыяльнымі зашпількамі-сцяжкамі, якія змяншаюць папярочнае расплескванне ступняў.
- Шкодна доўга стаяць на месцы без руху (напрыклад, чакаючы трамвая), асабліва калі ў руках у вас цяжкія сумкі.
- Пасля практыкаванняў з цяжарам (штанга, гантэлі, гіры) у становішчы стоячы карысна паплаваць, зрабіць вібрамассаж або ручны масаж ступняў.
- Калі плоскаступнёвасць ужо развілася, рэгулярна выконвайце спецыяльныя практыкаванні і самамасаж ступняў. З дапамогай артапеда падбярыце сабе супінатар і іншыя артапедычныя прынады.
- Не прытрымлівайцеся слепа моды. Падбірайце сабе і дзецям «правільны» абутак.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Хваробы стагоддзя

## З ДАПАМОГАЙ ФОТАДЫНАМІЧНАЙ ТЭРАПІІ РАК СКУРЫ ВЫЛЕЧВАЕЦЦА Ў 85-90% ВЫПАДКАЎ

**СУСВЕТНАЯ арганізацыя аховы здароўя вызначыла 2011 год як год папярэджання развіцця анкалагічных захворванняў.**

На сённяшні дзень традыцыйныя метады лячэння анкахворых не могуць цалкам задаволіць патрабаванні клінічнай практыкі. Гэта і прымушае спецыялістаў усяго свету шукаць новыя шляхі ў дыягностыцы і лячэнні пацыентаў са злаякаснымі пухлінамі. Адным з такіх метадаў з'яўляецца фотадынамічная тэрапія. Свой сур'ёзны ўклад у гэты накірунак зрабілі і беларускія медыкі.

Ужо 15 гадоў на РУП «Белмедпрэпараты» працуе ўласнае навукова-даследчае падраздзяленне, вынікам работы якога стала стварэнне і засваенне ў вытворчасці шэрагу ўнікальных інавацыйных лекавых сродкаў для прымянення ў розных галінах медыцыны, у тым ліку і ў анкалогіі.

Сярод арыгінальных лекавых прэпаратаў, створаных і выпускаемых РУП «Белмедпрэпараты», асобае месца займае фотасэнсібілізатар «Фаталон», які прызначаны для лячэння анкалагічных захворванняў новым сучасным метадам фотадынамічнай тэрапіі.

— Прымяненне гэтага метаду патрабуе наяўнасці шэрагу складальнікаў, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара па пытаннях інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты», кандыдат медыцынскіх навук Таццяна ТРУХАЧОВА**. — Сярод гэтых складальнікаў павінны быць эфектыўныя лекавыя сродкі і крыніца святла — лазер, які дазваляе правесці лячэбны сеанс. Таксама важная наяўнасць высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія дасканала валодаюць тэхналогіяй фотадынамічнай тэрапіі. Сёння ў рэспубліцы ўсё гэта ёсць. Нашым прадпрыемствам выпрацоўваецца фотасэнсібілізатар «Фаталон». Навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «ЛЭМТ» стварае сучасныя, высакаякасныя, бяспечныя, сартыфікаваныя лазеры. У краіне ёсць і навукоўцы, якія распрацавалі і засвоілі ў сваіх клініках метад фотадынамічнай тэрапіі для лячэння шэрагу анкалагічных захворванняў, а таксама для іх прафілактыкі.

Прэпарат «Фаталон» атрымаў шэраг патэнтаў як на склад вынаходніцтва, так і на спосабы яго прымянення. Работа па стварэнні «Фаталона» выконвалася прадпрыемствам у цесным супрацоўніцтве з вядучымі арганізацыямі сістэмы аховы здароўя Беларусі, а таксама з асноўнымі клінічнымі цэнтрамі Расіі.

— Першыя даследаванні пачаліся ў 1999—2000 гг., — расказвае **начальнік лабараторыі фармакалогіі і таксікалогіі РУП «Белмедпрэпараты» Сяргей ШЛЯХЦІН.** — І ўжо тады было даказана, што прымяненне гэтай методыкі ў хворых з пухлінамі скуры і слізістых абалонак, пераважна вонкавай лакалізацыі, дазваляе дасягнуць у 85-90% выпадкаў практычна поўнага вылячэння.

Вынікі гэтых даследаванняў з'явіліся падставай для афіцыйнай рэгістрацыі дазволу да шырокага клінічнага прымянення лекавага сродку «Фаталон» і метаду фотадынамічнай тэрапіі. У тыя ж гады на базе Інстытута анкалогіі быў створаны першы і пакуль адзіны ў рэспубліцы кабінет фотадынамічнай тэрапіі.

Далейшыя даследаванні даказалі, што метад можа выкарыстоўвацца пры лячэнні такіх новаўтварэнняў, як рак лёгкага, дэсімінаваных формах меланомы, захворваннях страўнікава-кішачнага тракту, мочавыдзяляльных шляхоў. Прычым даследаванні паказалі высокую эфектыўнасць методыкі, а самае галоўнае — бяспеку прымянення.

У 2008—2009 гг. у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі пачалі праводзіцца работы па вывучэнні эфектыўнасці фотадынамічнай тэрапіі пры лячэнні передракавых захворванняў. Размова ідзе пра захворванні шыйкі маткі ў жанчын, як правіла, дзетароднага ўзросту. Вынікі лячэння гэтым метадам дазволілі дасягнуць вылячэння хворых у 92% выпадкаў.

У тыя ж гады праводзіліся буйныя даследаванні па лячэнні такога цяжкага злаякаснага новаўтварэння, як пухліна галаўнога мозга. У выніку прымянення гэтая методыка дазволіла павысіць выжывальнасць пацыентаў пасля праведзенага лячэння, палепшыць іх якасць жыцця ў пасляаперацыйным перыядзе.

Вынікі даследчых работ, якія прадстаўлялі спецыялісты нашай рэспублікі на шматлікіх кангрэсах і сімпозіумах, прысвечаных лячэнню анказахворванняў, неаднаразова атрымлівалі высокія адзнакі сусветнай медыцынскай грамадскасці. У прыватнасці, летась на Сусветным кангрэсе па фотадынамічнай тэрапіі, які праходзіў у Сіэтле, даклад нашых спецыялістаў быў прызнаны лепшым навуковым паведамленнем кангрэса. А на 13-м фармацэўтычным форуме ў Сеуле прадпрыемства «Белмедпрэпараты» было ўдастоена вышэйшай узнагароды форума за распрацоўку шэрагу супрацьпухлінных сродкаў (у прыватнасці, прэпарата «Фаталон») і праведзеныя медыка-біялагічныя даследаванні, накіраваныя на барацьбу са злаякаснымі новаўтварэннямі.

**Вольга ШАЎКО.**

Прафілактыка

## ПІЕЛАНЕФРЫТ: НЕ ДАПУСЦІ РЭЦЫДЫВУ

**ПІЕЛАНЕФРЫТ — даволі распаўсюджанае захворванне нырак. Паводле статыстыкі, жанчыны хварэюць на яго ў пяць разоў часцей за мужчын. Апошнія, як адзначаюць медыкі, пакутуюць ад піеланефрыту, галоўным чынам, у пажылым узросце, калі з'яўляюцца праблемы з мочаспусканнем, выкліканыя пашкоджаннем прастаты. У жанчын жа існуе некалькі крытычных перыядаў, калі верагоднасць развіцця захворвання найбольш высокая: ранняе дзяцінства, перыяд палавога сталення, пачатак палавога жыцця, цяжарнасць.**

Піеланефрыт — інфекцыйна-запаленчы працэс, які пашкоджвае тканку ныркі. Хваробатворныя мікробы пранікаюць у ныракчную тканку як «узыходным» шляхам па мачаточніку з мочаспускальнага канала, мачавога пузыра (пры цыстыце, урэтрыце), так і праз кроў з іншых ачагоў інфекцыі ў арганізме — напрыклад, з насаглоткі (пры ангіне), поласці рота (пры карыесе). Але наяўнасць інфекцыі — не адзіная ўмова для ўзнікнення хваробы. Другая прычына з'яўлення піеланефрыту — ускладнены адток мачы (пры адэноме прастаты, цяжарнасці ў жанчын, анамальных зменах нырак і інш.). Садзейнічаюць развіццю захворвання гіпавітаміноз, пераахаладжэнне, зніжэнне імунітэту, цукровы дыябет і г.д.

Найбольш цяжка працякае востры піеланефрыт. Як правіла, захворванне пачынаецца востра, з'яўляюцца высокая (да 40 °С) тэмпература, дрыжыкі, праліўны пот, боль у паяснічнай вобласці, смага, млоснасць, парушэнні мочаспускання, з'яўленне мутнага асадка ў мачы. Пры з'яўленні сімптомаў вострага піеланефрыту неабходна як мага хутчэй звярнуцца да доктара! Не варта недаацэньваць цяжкасць захворвання і займацца самалячэннем. Прамаруджванне можа абярнуцца сур'ёзнымі ўскладненнямі — аж да страты ныркі і пагрозы для жыцця чалавека. Лячэнне вострага піеланефрыту праводзіцца ва ўмовах стацыянара.

Хранічны піеланефрыт, як правіла, вынік недалечанага вострага працэсу, калі ўдалося зняць запаленне, але не ўдалося ні цалкам знішчыць усіх узбуджальнікаў у нырцы, ні аднавіць нармальны адток мачы з ныркі. Ён можа працякаць бессімптомна, а можа непакоіць чалавека тупымі ныючымі болямі ў паясніцы (асабліва ў сырое халоднае надвор'е), частымі позывамі на мочаспусканне, перыядычным «беспрычынным» павышэннем тэмпературы, патлівасцю па начах.

Пры вострай форме піеланефрыту, пры абвастрэнні хранічнага працэсу хворым, акрамя актыўнай антыбактэрыяльнай тэрапіі, неабходны пасцельны рэжым. У цяпле, спакоі і гарызантальным становішчы ныркі лепш забяспечваюцца крывёю, лягчэй фільтруюць яе. Зрабіце чысташарсцяны пояс на паяснічную вобласць або проста абвяжыцеся пуховай хусткай. Насіце іх пастаянна, не здымаючы ні ўдзень, ні ўначы, і тады выздараўленне пойдзе хутчэй.

**УВАГА!** Многія хворыя, ведаючы пра наяўнасць у іх піеланефрыту, пры з'яўленні сімптомаў абвастрэння, самастойна пачынаюць ужываць прэпараты, якія ім калісьці прызначыў доктар. Прыняўшы некалькі таблетак, адчуваюць паляпшэнне стану і спыняюць лячэнне. Такі падыход вельмі небяспечны, паколькі неадэкватная па складзе і тэрмінах антыбіётыкатэрапія вядзе да з'яўлення антыбіётыкаўстойлівых штамаў мікраарганізмаў, што значна ўскладняе далейшае лячэнне.

*Каб не даць бактэрыям «атабарыцца і размнажацца» ў нырках, «вымывайце» іх.* Для гэтага штодзень неабходна выпіваць каля 2 л вадкасці. Сокі, асабліва свежавыціснутыя, лепш напалову разбаўляць вадой. І ніякага алкаголю і піва — яны толькі «падганяць» хваробу. Пазбягайце ў рацыёне цяжкай ежы, канцэнтраваных і экстрактыўных рэчываў (булёнаў), тлустага, вострага і салёнага. Уключайце ў меню стравы з агародніны, садавіны, кісламалочныя прадукты, яйкі, адвараныя мяса і рыбу. Уролагі раяць павялічыць у рацыёне колькасць баклажанаў, гарбузоў, дыні, кавуноў, якія аказваюць мачагоннае дзеянне і садзейнічаюць ачышчэнню мачавых шляхоў ад мікробаў, слізі. Чарніцы, журавіны і брусніцы — увогуле карысныя ва ўсіх відах. Свежыя або замарожаныя, у морсе ці кампоце, яны змяншаюць запаленчыя з'явы і забяспечваюць арганізм вітамінамі.

Для прафілактыкі запаленчых працэсаў у нырках неабходна ў першую чаргу ліквідаваць усе патэнцыйныя ачагі інфекцыі ў арганізме (звярніце ўвагу на стан зубоў, міндалін, прыдатачных пазух носа; варта выключыць захворванні палавой сферы). Трэба апранацца па сезоне, пазбягаць пераахаладжэння і празмерных фізічных нагрузак.

*Разам з медыкаментознымі і фізіятэрапеўтычнымі метадамі хворым на піеланефрыт рэкамендуецца прыём лекавых раслін.* Фітатэрапія прымяняецца не толькі на этапе абвастрэння захворвання, але і як спосаб прафілактыкі.

- Змяшаць роўнымі часткамі звербой, крапіву, брусьнічнік, цвінтарэй, шыпшыну. 1 ст. лыжку збору заліць 0,5 л кіпеню і настойваць паўгадзіны, піць па 100—150 мл у суткі.
- Насенне лёну (50 г), лісце бярозы (30 г), лісце крапівы (20 г), лісце суніцы (10 г). 2 ст. лыжкі збору заліць кіпенем, пачакаць паўгадзіны, працадзіць, настой прымаць у цёплым выглядзе на працягу дня.
- Узяць лісце бярозы, ягады ядлоўцу, траву ныракчнага чаю і спарышу ў суадносінах 1:1:1:2, заварыць 1 ст. лыжку збору шклянкай кіпеню ў тэрмасе на 30 хвілін.
- Складзіце збор з лісця брусніц і талакнянкі (мядзведжыя вушкі), травы крапівы і пладоў жосцеру (2:2:2:3). Заліце 1 ст. лыжку сухой сыравіны шклянкай кіпеню, настойвайце 30 хвілін у цёплым месцы.

Аднак памятайце, што працяглы прыём настояў і адвараў лекавых раслін выклікае павышанае мочааддзяленне, пры гэтым з мачой выводзіцца вялікая колькасць вельмі патрэбнага арганізму калію. Таму для яго папаўнення ў меню неабходна ўключаць абрыкосы, курагу, разынкі, парэчкі, пятрушку.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

### СУПРАЦЬ РАКУ ШЫЙКІ МАТКІ

У Мінску з 2013 года пачнуць бясплатна прышчапляць супраць папілома-вірусная інфекцыі, якая выклікае рак шыйкі маткі і іншую паталогію, паведамілі БЕЛТА ў Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі. Асаблівасць вакцынацыі заключаецца ў тым, што яна не дае хуткага эфекту. Вынік пасля такой прышчэпкі праяўляецца праз 15—20 гадоў. Адпаведна, узровень захваральнасці на рак шыйкі маткі знізіцца менавіта праз некалькі дзясяткаў гадоў.

## «ЗАВАЯВАЎ» ДЗІЦЯ — ПРЫМУСІЎ РАСКАШЭЛІЦЦА ЯГО БАЦЬКОЎ!

**АГРЭСІЎНАЯ маркетынгавая і рэкламная палітыка вытворцаў нездаровага харчавання, якія абралі маладое пакаленне аб'ектам для атрымання прыбытку, не пакінула абыякавай Сусветную арганізацыю аховы здароўя. Спецыялістамі СААЗ быў падрыхтаваны звод рэкамендацый па маркетынгу харчовых прадуктаў і безалкагольных напіткаў, арыентаваных на дзяцей. Паводле ацэнак экспертаў СААЗ, у 2010 годзе больш як 42 мільёны дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў мелі залішнюю вагу цела ці атлусценне. Прычым паказчыкі залішняй вагі і атлусцення працягваюць расці ва ўсіх краінах свету паралельна з распаўсюджваннем пунктаў продажу прадуктаў хуткага харчавання і шырокамаштабнай рэкламай нездаровай ежы, якую яшчэ называюць «смеццевай ежай».**

Звесткі, атрыманыя ў выніку правядзення сістэматычных даследаванняў маштабаў, характару і наступстваў маркетынгу харчовых прадуктаў для дзяцей, дазваляюць зрабіць выснову, што ў большасці выпадкаў аб'ектам маркетынгу з'яўляюцца прадукты з высокім утрыманнем у іх тлушчаў, цукру і солі: чыпсы, арэхава-шакаладныя батончыкі, сухія закускі, газіроўкі і іншыя. Ёсць таксама доказы таго, што тэлерэклама істотна ўплывае на харчовыя прыхільнасці дзяцей і іх просьбы аб пакупцы. Прасцей кажучы, дзеці разглядаюцца вытворцамі прадуктаў харчавання ў якасці сродку магутнага ўздзеяння на бацькоўскія выдаткі. Але для таго, каб завалодаць увагай дзяцей, абавязкова трэба прыдумаць цікавы брэнд, яркую ўпакоўку і рэкламу, якая б «чапляла».

Аранжавае малако, фіялетавы кетчуп, зялёны ёгурт— цудоўны спосаб накарміць дзіця прадуктамі, якія ён адмаўляецца есці. Бамбасцеры, тэлепузікі, пакемоны цікавяць дзяцей значна больш, чым карысныя ўласцівасці прадуктаў. Прыдумаўшы калісьці Happy Meal з цацкай, «Макдональдс» атрымаў самую лаяльную аўдыторыю ў свеце. Цацка дапамагае прадаць дзецям той тавар, які, магчыма, сам па сабе ім нецікавы. Гэты прыём лічыцца бяспройгрышным, паколькі многія дзеці просяць бацькоў набыць ім той ці іншы прадукт выключна дзеля цацкі. Хітрыя маркетынгавыя ходы спрыяюць устойлівай прывязанасці да таго ці іншага брэнда, а тэлебачанне з'яўляецца для падрастаючага пакалення адной з асноўных крыніц інфармацыі. У Брытаніі, напрыклад, падлічылі, што дзеці глядзяць на працягу года каля 10 тысяч рэкламных ролікаў і да 10 гадоў пазнаюць ужо да 400 брэндаў.

Між іншым, даследаванне, якое праводзілася групай псіхолагаў на працягу 18 месяцаў, дае магчымасць сцвярджаць, што дзеці да 8 гадоў увогуле не разумеюць карыслівых намераў вытворцаў рэкламных ролікаў. Яны не здольны вызначыць, што ў рэкламе з'яўляецца перабольшаннем, якое не стасуецца з рэальным жыццём. Якраз па прычыне высокай унушальнасці дзяцей адзіна правільным рашэннем, на думку псіхолагаў,была б поўная забарона ўсёй рэкламы, што «атакуе» дзяцей. А пакуль што маркетынг нездаровых прадуктаў харчавання можа насцігнуць дзіця абсалютна ў любым месцы: у інтэрнэце, у супермаркеце, па дарозе ў школу, па тэлебачанні, пры праглядзе мультфільма і гэтак далей. У Еўропе і ЗША стваральнікі дзіцячага кіно і мультфільмаў яшчэ з моманту прыдумвання герояў супрацоўнічаюць з вытворцамі тавараў для дзяцей, і на момант выхаду мультфільма ці кінастужкі на экран у продажы з'яўляюцца шакаладныя батончыкі, чыпсы, сыркі і іншыя тавары з новым персанажам на ўпакоўцы. Фільм у гэтым выпадку з'яўляецца інструментам для іх прасоўвання.

Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя падкрэсліваюць, што «ў месцах, дзе збіраюцца дзеці, не павінен ажыццяўляцца ні ў якіх формах маркетынг харчовых прадуктаў з высокім утрыманнем насычаных тлушчаў, транстлустых кіслот, свабоднага цукру і солі. Пералік такіх месцаў уключае яслі, школы, школьныя пляцоўкі і дашкольныя цэнтры, гульнявыя пляцоўкі, сямейныя і дзіцячыя клінікі і педыятрычныя службы, а таксама спартыўныя і культурныя мерапрыемствы з удзелам дзяцей».

Досвед па абмежаванні рэкламы нездаровай ежы, скіраванай на дзіцячую аўдыторыю, існуе ў Вялікабрытаніі, Францыі, Аўстраліі і некаторых іншых краінах свету. Напрыклад, у Вялікабрытаніі дзейнічае забарона на рэкламу нездаровай ежы падчас тэлевізійных праграм для падлеткаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**о проведении повторных открытых аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйскагромаш» (продавец), в составе следующих лотов (предмет торгов):**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Незавершенное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-5535 (крытая стоянка испытательной техники) общ. пл. 364,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13 в | | |
| Лот № 2 | Незавершенное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-5536 (экспериментально-производственный корпус) общ. пл. 3 775 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13 б | | |
| Лот № 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-5568 (бытовой городок-ремонт машин) общей площадью 688,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, 5 | | |
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНН 102353509 (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331) | | |
| Место проведения торгов и подачи документов | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» | | |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Бобруйскагромаш» – р/с 3012000360025 в Первомайском отд. ОАО «БелПСБ» г. Бобруйска, код 329, УНН 700067572, ОКПО 00238776 | | |
| Общие сведения | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 |
| Дата и время проведения торгов | 17 февраля 2011 г. в 14.30 | | 11 февраля 2011 г. в 14.30 |
| Начальная цена продажи, рублей без учета НДС | 97 405 272 рубля, размер задатка 5 % – 4 870 264 руб. | 769 789 489 рублей, размер задатка 5 % – 38 489 474 руб. | 335 112 253 рубля, размер задатка 5 % – 16 755 610 руб. |
| Площадь земельного участка | 0,2069 га – кадастровый № 741000000007001138, правовой режим – пост. пользование | 0,7153 га - кадастровый № 741000000007001139, правовой режим – пост. пользование | 0,2457 га, кадастровый № 741000000001000332, правовой режим – пост. пользование |
| Условия продажи | По лотам № 1 и № 2 – аукцион без условий; по лоту № 3 – подсобные помещения площадью 29,21 и 19,92 кв.м с тамбуром площадью 3,43 кв.м сданы в аренду до 31.12.2012 г. | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов | | |
| Условия оплаты | Определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи | | |
| Срок подачи документов, осмотра лотов и внесения задатка | Включительно по 15 февраля 2011 г. до 18.30 | | Включительно по 09 февраля 2011 г. до 18.30 |

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 09.06.2010 г. (по лоту № 3) и от 20.08.2010 г. (по лотам № 1 и № 2).

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬИСПОЛКОМ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенных на территории сельсовета**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Гребень, д. 52а 624484002101000108 | 0,1993 | Сети электроснабжения | 1 525 750 | 7 800 000 | 780 000 |
| 2 | д. Войровка, ул. Полевая, д. 11 624484001601000178 | 0,1232 | Сети электроснабжения | 1 525 750 | 5 550 000 | 555 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3604625110018 в ЦБУ № 626 г. Марьина Горка, ф-л № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» 222810, г. М. Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001601, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа 04616, доходы, связанные с проведением аукционов, Новопольский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Аукцион состоится **16 февраля 2011 года в 15.00** по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11 февраля 2011 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны: (801713) 30316, 30335. Сайт в интернете Пуховичского райисполкома.

